# ЗЬВЯЗДА

Пралетары всіх краёў, злучайцеся!

№ 159 (3267) Аўторак, 16-га ліпеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—819, кантора—781


**РАДЫЁ НОЧЫ:**

**ШАНХАЙ, 15. Агэнцтва „Гомінь" паведамляе аб назначэньні на розныя пасады на К.-Усх. чыг. 80 белагвардзейцаў. Па вестках таго-ж агэнцтва, 3 брыгады кітайскага войска разьмешчаны на лініі Харбін — ст. Манчжурыя, якая вельмі ўзмоцнена.**

**НАВІНЫ Б. С. С. Р.**

## Сяляне патрабуюць лямпачкі Ільліча

*БАБРУЙСК. (Наш кар.). Сяляне вёскі Дзеднава ўзьнялі перад Акрвыканкомам хадайніцтва аб электрафікацыі іх вёскі.*

*Акрвыканком разглядзеўшы гэта хадайніцтва, пастанавіў уключыць у будаўнічы плян 1929-30 г. работы па электрафікацыі вёскі Дзеднава.*

# На заклік Фрунз. райкому КП(б)Б зьявіліся звыш 10000

**Паведамленьне аб новым, нячуваным яшчэ па нагласьці, налёце кітайскіх мілітарыстых на нашы ўстановы і арганізацыі на Усходня-Кітайскай чыгунцы выклікала вялікае абурэньне шматтысячнай рабочай масы, якая сабралася на адкрыты райпартсход Фрунзаўскага рэёну. Па гэтым пытаньні сход аднагалосна прыняў асобную рэзалюцыю. Вось яна:**

**— „КІТАЙСКАЯ ВАЕНШЧЫНА, ПАД ДУДКУ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫХ ДЗЯРЖАЎ, СВАІМ НЯЧУВАНА НАГЛЫМ НАПАДАМ НА САВЕЦКІЯ І РАБОЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ЎСХОДНЯ-КІТАЙСКАЕ ЧЫГУНКІ, ЗНОЎ КІНУЛА ВЫКЛІК МІРНАЙ ПАЛІТЫЦЫ САВЕЦКАГА САЮЗУ**

**МЫ, РАБОЧЫЯ ФРУНЗАЎСКАГА РАЁНУ г. МЕНСКУ, У КОЛЬКАСЬЦІ 10 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК, САБРАЎШЫСЯ НА СУПОЛЬНЫ СХОД З РАЁННАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯЙ, З УСЕЙ РАШУЧАСЬЦЮ ПРАТЭСТУЕМ СУПРОЦЬ ГЭТАЙ НОВАЙ ПРАВАКАЦЫІ І ЗАЯЎЛЯЕМ, ШТО МЫ ЎСЕ, ЯК АДЗІН ЧАЛАВЕК, ПАДТРЫМАЕМ ДА КАНЦА ЎСЕ КРОКІ САВЕЦКАГА ЎРАДУ, НАКІРАВАНЫЯ ДА ПОЎНАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ГРАНІЦ САВЕЦКАГА САЮЗУ АД ПАДОБНЫХ ВЫЛАЗАК МІЖНАРОДНАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ".**

## ГОЛАС МАС

**Грандыёзным сходам у садзе «Прафінтэрн», Фрунзаўскі райком КП(б)Б палажыў першы камень сапраўднае мабілізацыі мас, сапраўднай, а не казённай падрыхтоўкі да правядзеньня Міжнароднага Чырвонага Дня. На адкрыты сход Фрунзаўскае райпартарганізацыі зьявілася звыш 10.000 беспартыйных рабочых раёну. Зьявіліся —стройнымі калёнамі з аркестрамі музыкі на чале, прышлі адзіночкі, прышлі сямейныя рабочыя з жонкамі і дзецьмі. Прышлі ў час, у вызначаную гадзіну. Цярпліва чакалі пачатку пасяджэньня. Не разыходзіліся да канца.**

**Трэба было бачыць гэта мора галоў, гэтыя напружана-уважлівыя твары!**

**Трэба было чуць простыя прамовы выступаўшых рабочых і магутныя выбухі авацый пасьля кожнага выступленьня!**

**Трэба было чуць «Інтэрнацыянал», які стройна пяяла ўся шматтысячная маса!**

**Рабочыя Фрунзаўскага раёну з энтузіязмам, якога нельга перадаць, прадэманстравалі сваю адданасьць справе сацыялістычнага будаўніцтва, сваё бязьмежнае давер'е нашай партыі і Савецкай Уладзе.**

**Пастановы агульнага сходу, за якія ўзьнімаўся цэлы лес рук, красамоўна гавораць аб гэтым.**

**— «Прасіць савецкі ўрад і партыю выпусьціць новую пазыку індустрыялізацыі. Мы падпішамся на яе, мы праводзім ПАПЯРЭДНЮЮ падпіску, мы САБРАЛІ ЎЖО тысячы рублёў. Мы за ўзмацненьне тэмпу індустрыялізацыі!» —вось што сказалі фрунзаўскія рабочыя.**

**— «Мы ведаем, што НАШАЙ партыі патрэбны моцныя рабочыя, каб кіраваць будаўніцтвам сацыялізму, узмацняць дыктатуру пралетарыяту. Мы дамо такіх рабочых, мы УЖО вылучылі ў рады партыі нашых лепшых таварышоў»—так заявілі фрунзаўскія рабочыя, перадаючы ў партыю 58 старых, кваліфікаваных рабочых.**

**— «Мы ведаем, што міжнародны капітал рыхтуе новую бойню і перш за ўсё—напад на наш Саюз. Мы акажам ПОЎНУЮ і ДА КАНЦА дапамогу ўсім мерапрыемствам партыі і савецкай уладзе, якія накіраваны да ўзмацненьня абароназдольнасьці нашай краіны, да забесьпячэньня непарушнасьці нашых межаў»,—заявілі рабочыя, уздымаючы голас абурэньня і пратэсту супроць новай правакацыі на Ўсходня-Кітайскай чыгунцы.**

**— «Мы за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы, за сацыялістычнае спаборніцтва, за палепшаньне якасьці прадукцыі, за калектывізацыю вёскі, за рашучае выкарчоўваньне каранёў капіталізму ў нашай краіне; мы на справе змагаемся і яшчэ больш упарта будзем змагацца з усімі недахопамі на вытворчасьці»—сказалі рабочыя, прымаючы рэзалюцыю па дакладу тав. Славінскага.**

**І яшчэ адно сказалі фрунзаўскія рабочыя**

**— «Мы—за міжнародную салідарнасьць пралетарыяту. На падрыхтоўку сусьветнага імпэрыялізму да новае бойні, адкажам энэргічнай падрыхтоўкай і правядзеньнем Міжнароднага Чырвонага Дня».**

Тав. АЎГУСЬЦІНЯК—ліцейшчык заводу «Камунар», 39 год працуе на вытворчасьці які падаў заяву аб уступленьні ў партыю

## УЛАСНЫМІ СРОДКАМІ

Голас тысяч праз сваіх прамоўцаў паставіў перад сходам пытаньне аб канкрэтных кроках па хадайніцтве перад урадам адносна выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Кожны сьвядомы рабочы добра разумее, што будаўніцтва новых фабрык і заводаў не магчыма без затраты вялізных сродкаў. Чакаць дапамогі ад замежных імпэрыялістых нам не прыходзіцца. Таму мы павінны абыйсьціся нашымі ўласнымі сродкамі. Самым правільным выхадам для вырашэньня гэтай задачы зьяўляецца выпуск 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Вось гэта думка аб выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі для поўнай гарантыі ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну індустрыялізацыі краіны ўжо становіцца здабыткам шырокіх колаў рабочых фабрык і заводаў Беларусі.

— Даеш 3-ю пазыку індустрыялізацыі, стопроцантнае выкананьне пяцігодкі будаўніцтва,—вось што заявілі паседзячора на сходзе Фрунзаўскай партарганізацыі выступаўшыя ў спрэчках на дакладу т. **Славінскага** ад імя шмат тысяч працоўнай масы.

— На імкненьні імпэрыялістых закабаліць нашу краіну, лепшым адказам будзе ажыцьцяўленьне прапаноў рабочых аб выпуску 3-е пазыкі.

Дзяржава зараз мае вялікую патрэбу ў сродках, трэба яе падтрымаць. Таму лічым, што неабходна зараз-жа выпусьціць 3-ю пазыку.

— Мы чакаем ад ураду прыняцьця прапановы аб новай пазыцы. Калі яна будзе выпушчана, рабочыя, сяляне і служачыя свой абавязак выканаюць,— усе ў адзін голас заяўляюць прамоўцы.

І сход вынес пастанову:

**— Паставіць пытаньне перад ЦК КП(б)Б і хадайнічаць перад Саюзным Урадам аб неадкладным выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі.**

Гэту пастанову пакрываюць нязмоўчныя воплескі, што гучна разносяцца з-пад мазолістых далоняў мас...

Рабочыя добра разумеюць, што дасьць краіне індустрыялізацыя. Яны ведаюць, што кожны новы завод, кожная новая фабрыка і новы варштат надае больш моцы Савецкаму Саюзу, пасоўваючы яго ўперад па шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

## Асадзіць кітайскіх захватчыкаў!

Кітайскія мілітарыстыя—тыя самыя, якія нядаўна зрабілі налёт на савецкае консульства ў Харбіне, зрабілі новае беззаконьне—па гэты раз на Кітайска-Усходняй чыгунцы. Гэтыя кітайскія генэралы і раней гвалтам умешваліся ў кіраваньне чыгункай, якая паводле дагавораў 1924 году зьяўляецца супольным прадпрыемствам СССР і Кітая і захватвалі належачую ёй каштоўную маёмасьць, якой яны потым карысталіся для ўласнага ўзбагачэньня. На гэты раз, аднак, яны пайшлі далей. Паводле згод 1924 г. чыгункай кіруе кіраўніцтва, якое складаецца з роўнага ліку савецкіх і кітайскіх членаў, а бягучае кіраўніцтва належыць кіраўніку чыгункай—савецкаму грамадзяніну з двума памочнікамі, з якіх таксама адзін савецкі грамадзянін. Ня гледзячы на тое, што ўсякае новае пытаньне павінна вырашацца ў праўленьні большасьцю галасоў, г. зн. па згодзе кітайскага і савецкага боку, а ў выпадку разгалосьсяў перадаецца на разгляд ураду, кітайскія ўлады, ня склікаючы нават праўленьня, раптам зрабілі на чыгунцы сапраўдны пераварот, гвалтам зьняўшы з работы кіраўніка тав. Емшанава, яго памочніка і ўсіх кіруючых савецкіх супрацоўнікаў кіраўніцтва чыгункі. Частка іх арыштавана і ўжо выслана. Адначасова разгромлены ўсе прафсаюзныя і каапэрацыйныя арганізацыі рабочых і служачых чыгункі і арыштавана каля 200 чалавек з прафсаюзнага актыву. Усе гэтыя гвалты прыкрываюцца самымі недарэчнымі, высмактанымі з пальца абвінавачваньнямі па адрасу т. Емшанава і пустымі ў вуснах гвалтаўнікоў фразамі, адносна абавязацельства бакоў захоўваць згоды, якія самі-ж кітайскія ўлады так груба парушаюць.

Пасьля гісторыі з харбінскім консульствам, савецкі ўрад ужо папярэдзіў кітайскіх налётчыкаў, каб яны не разьлічвалі ў далейшым на яго доўгацярпліваасьць. Новая грандыёзная правакацыя на Кітайска-Усходняй чыгунцы, якую кітайскія генэралы на радасьць імпэрыялістым, хочуць захапіць у свае рукі і або раскрасьці, або аддаць у рукі чужаземнага капіталу, паказвае, што гэта папярэджаньне ня мела свайго ўплыву.

Бінаватыя ў налётах думаюць, відаць, што наша ўсім вядомае міралюбства ёсьць проста слабасьць, і што калі мы раней мірыліся з дробнымі правакацыямі, дык мы таксама памірымся і з гэтым захопам ўсяго кіраўніцтва чыгункі ў кітайскія рукі. Гэтыя здрадзнікі сваіх уласных нацыянальных інтарэсаў і прыслужнікі імпэрыялізму зараз-жа пераканаюцца, што яны жорстка памыляюцца. Савецкі ўрад ужо адказаў на харбінскія падзеі нотай, у якой са звычайным спакоем пералічыў усе дапушчаныя кітайцамі самыя грубыя парушэньні дагавораў, і паказаў, што ён гатоў, ня гледзячы ні на што, яшчэ раз працягнуць кітайскім уладам руку і прапанаваць ім дагаварыцца па ўсіх спрэчных пытаньнях, якія датычаць К.-Ус. чыгункі. Але савецкі ўрад адначасова патрабаваў неадкладнага спыненьня правакацыйных дзеяньняў і вызваленьня арыштаваных рабочых і служачых чыгункі. **Кітайскім уладам даецца тры дні, у працягу якіх яны павінны вырашыць, ці жадаюць яны прыняць прапанову СССР, якая прадыктавана нязьменнай дружбай працоўных СССР да прыгнечанага кітайскага народу, або яны аддаюць перавагу таму, каб ісьці шляхам правакацый і гвалтаў, і, значыць, прыняць на сябе адказнасьць за няўхільныя вынікі.**

Савецкая грамадзкасьць,увага якой пры цягнута да варожых і правакацыйных дзеяньняў манчжурскіх улад, ня толькі выяўляе ў сваіх водгуках, што яна поўнасьцю падтрымлівае пазыцыю свайго ўраду, але і патрабуе, каб гэтым правакацыям быў пакладзены рашучы канец. Рабочыя і сяляне СССР зьвяртаюцца праз галовы кітайскіх наймітаў імпэрыялізму да рабочых і сялян Кітая, да грамадзкае думкі гэтай краіны, і патрабуюць ад іх асадзіць манчжурскіх захватчыкаў. **Савецкі Саюз — адзіная краіна, якая адмовілася ў Кітаі ад усіх няроўных дагавораў і прывілеі і заключыла з ім згоду на пачатках сапраўднае роўнасьці і ўзаемнасьці.** Ніхто ня прымушаў Кітай да заключэньня гэтых дагавораў з СССР, дзякуючы падтрыманьню якога Кітай толькі і мог разгарнуць сваю кампанію барацьбы супроць няроўных дагавораў. Гэтыя добраахвотныя і справядлівыя савецка-кітайскія згоды ўстанаўляюць пэўны парадак вьмешанага кіраваньня Кітайска-Усходняй чыг., якая была пабудавана на расійскія народныя грошы, і кітайскім сатрапам, якія спрабуюць гвалтам зьмяніць гэты парадак, савецкая грамадзкасьць павінна сказаць: рукі прэч!

## Заўжды і ўсюды з рабочай клясай

Моц ленінскай камуністычнай партыі ў тым, што яна глыбока ўрасла ў рабочую клясу, што яна ўбірае ў сябе на працягу ўсяе свае гісторыі лепшыя сілы пралетарыяту, усё перадавое, што расьцяць у сваіх радох рабочыя масы. Камуністычная партыя, як ніякая іншая партыя ў сьвеце, у сваёй штодзённай, практычнай рабоце цесна зьвязана з масамі, на выкананьне кожнай з сваіх задач вядзе мільёны. Мільёны рабочых, сялянскае беднаты, батрацтва і серадняцкія пласты вёскі ішлі і ідуць толькі за кампартыяй, адзіным вартаўніком і абаронцам іхніх інтарэсаў. Гэта мы бачым у штодзённай нашай практычнай рабоце, гэта мы бачым у любой партыйнай арганізацыі.

**Фрунзаўская партарганізацыя** на 14 ліпеня прызначыла свой агульны адчынены райпартсход. На гэты сход праз ячэйкі было **запрошана 10 тысяч рабочых прадпрыемстваў раёну.** Рабочыя сваім прыходам на сход прадэманстравалі, што яны заўсёды дапамагалі і гатовы дапамагчы сваёй партарганізацыі ў яе вялікай і адказнай рабоце. Да прызначанага тэрміну рабочыя стройнымі калёнамі пад штандарамі прышлі на сход сказаць сваё важкае слова па пытаньнях парадку дню. Калёна за калёнай, з песьнямі ўліваецца ўмасу сходу, а за імі ідуць новыя, з другіх прадпрыемстваў і выгукваюць лёзунгі:

— Заўсёды і ўсюды з ленінскай партыяй!

— Пад кіраўніцтвам партыі пабудуем новыя фабрыкі і заводы!

Сакратар райкому КП(б)Б т. **Гурэвіч** адчыняючы сход, у сваім кароткім уступным слове адзначыў:

— Рабочыя сёньня яшчэ раз паказалі, што яны з партыяй. Яны выявілі сваю гатоўнасьць па закліку партыі стаць у рады для абароны Савецкага Саюзу ад капіталістых, якія рыхтуюць вайну супроць СССР. Мэталістыя, будаўнікі, швэйнікі і рабочыя другіх прадпрыемстваў раёну, рабочыя торфараспрацовак, сэзоннікі з розных куткоў СССР у ліку 200 чалавек, якія прышлі за 14 вёрст, ужо прысутнічаюць на даным сходзе—гэта паказчык мабілізацыйнай гатоўнасьці пралетарыяту нашага раёну.

Пасьля выбараў прэзыдыуму, у які ўвайшлі члены і кандыдаты бюро райкому, Акругкому, ЦК, члены прэзыдыуму АКК і ЦКК, члены фракцыі ЦСПСЕ і рэдактар ЦО КП(б)Б «Зьвязды», прадстаўнікі ад часьцей Чырвонай арміі, сход ухваліў у парадку дню паставіць пытаньне: **аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР.**

Пад гучныя воплескі, якія перайшлі ў авацыю, сход выбірае ў ганаровы прэзыдыум **т. Сталіна, Калініна, Молатава, Варашылава, Арджанікідзе, Тэльмана** (сакр. кампартыі Нямеччыны) і **Гамарніка.**

### У АДКАЗ НА ЗАХОПНІЦКІЯ ПЛЯНЫ КАПІТАЛІСТЫЯЎ — ПРЫСЬПЕШЫМ ТЭМП ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ САВЕЦКАЕ КРАІНЫ, УМАЦУЕМ ЯЕ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦЬ

З дакладам аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР выступіў сакратар Менскага Акругкому КП(б)Б тав. **Славінскі.**

Дакладчык ва ўступнай частцы свайго дакладу застанавіўся на тых правакацыйных выпадах капіталістых супроць СССР, якія мелі месца апошнімі днямі на Кітайска-Усходняй чыгунцы.

— Гэта,—кажа т. Славінскі,—адзін з тых выпадкаў, якія на працягу ўсяго часу сусьветны, асабліва ангельскі і японскі,імпэрыялізм накіроўвае супроць СССР з мэтай справакаваць на вайну. Наш урад і наша партыя на працягу ўсяго часу праводзяць палітыку міру. Аднак і партыя і ўрад заўсёды даюць поўную ацэнку таму, што дзеецца вакол Савецкага Саюзу. Камуністычная партыя за досыць доўгі пэрыяд да імпэрыялістычнай вайны 1914 году, улічыўшы абставіны, прадбачыла гэтую вайну, сыгналізавала аб гэтым. І зараз калі рад канкрэтных паказчыкаў, рад тайных ваенных дагавораў заключылі паміж сабою ряд буржуазных краін, калі гэтыя краіны шалёна ўзбройваюцца, пагроза новай імпэрыялістычнай вайны паўстае ў рэальным абліччы. Мы вымушаны папярэдзіць перад сабою задачу ня толькі сыгналізаваць аб небясьпецы новых імпэрыялістычных войн, а падрыхтавацца так, каб у любы момант даць цьвёрды і жорсткі адпор тым, хто пасягае на бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту—СССР.

Аб тым, што капіталістыя рыхтуюцца да новых войн, прыкрываючыся гутаркамі аб міры, аб тым, што шалёным тэмпам растуць іх захопніцкія пляны, гаворыць рост іх армій і ўзбройваньняў. Калі па пяці буйных капіталістычных дзяржавах сьвету ў 1913 г. арміі зьлічваліся ў 1.827.000 чал., то ў 1928 г., у гэтых-жа краінах арміі складаюць 2.266.000 чалавек. А калі да гэтага дадаць яшчэ скрытыя рэзэрвы, то гэта лічба павялічыцца ў два разы. Ня менш шпаркім тэмпам расьце ваенна-тэхнічнае ўзбройваньне ў дзяржавах капіталу. Па гэтых-жа 5 капіталістычных буйнейшых дзяржавах у 1923 годзе было 2 570 лётніцкіх машын, а ў 1928 годзе іх налічваецца 4.480. А пэрспэктыўныя пляны на будучыя гады накіраваны на яшчэ большае павялічэньне. Рост вайсковых бюджэтаў па капіталістычных краінах, нават такіх дробных, як Польшча і Румынія, ідзе ў гару шалёным тэмпам.

Потым дакладчык даў аналіз эканамічнага становішча буйнейшых капіталістычных краін, спыніўся на асноўных момантах супярэчнасьцяй, асабліва адзначыў шмат месца ў сваім дакладзе пытаньню беспрацоўя ў капіталістычных краінах, якое зьяўляецца вынікам капіталістычнай рацыяналізацыі.

Гаворачы пра рост рэвалюцыйнага руху, **т. Славінскі** сказаў:

— Першае мая 1929 г. найлепшы паказчык таго, наколькі вырасла рэвалюцыйная сьвядомасьць рабочых мас у капіталістычных краінах, наколькі рэвалюцыйны рух ахоплівае ўсё больш і больш шырокія масы рабочых. Рабочая кляса **Нямеччыны,** пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, якая правяла вялікую работу па бальшавізацыі сваіх радоў, па барацьбе з «левымі» і правымі ўхіламі, ня гледзячы на крывавыя рэпрэсіі паліцэйскіх, на цкаваньні сацыял-дэмакратычных здраднікаў, вышла на вуліцы прадэманстраваць сваю гатоўнасьць да барацьбы за справу сацыяльнага вызваленьня. **У Францыі, Чэхаславакіі** і інш. капіталістычных дзяржавах пралетарыят на чале з камуністычнай партыяй паказаў сваю рэвалюцыйную магутнасьць, выкрыўшы розныя здрадніцка-прадажныя махінацыі сацыял-дэмакратаў.

— Набліжаецца Міжнародны Чырвоны Дзень. У капіталістычных краінах пралетарыят гэты дзень будзе праводзіць пад лёзунгам праверкі свае баявое моцы, пад лёзунгам выкрываньня захопніцкіх памераў і плянаў імпэрыялістых супроць СССР, пад знакам яшчэ большага згуртаваньня пралетарскіх сіл пад баявыя сьцягі Камінтэрну. У нас, у Савецкім Саюзе, гэты дзень павінен прайсьці пад знакам узмацненьня індустрыялізацыі краіны, узмацненьня абароназдольнасьці. Мы павінны будзем сканцэнтраваць нашу ўвагу на практычных задачах па выкананьні пяцігодкі, на пытаньнях павялічэньня фондаў для эканамічнага і культурнага разьвіцьця СССР.

### ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА! ЗА ЎЗДЫМ ВЫТВОРЧАСЬЦІ ПРАЦЫ! ЗА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ!

— Ня спыняючыся на ўнутраным становішчы нашае краіны,—кажа далей тав. Славінскі,—не гаворачы аб тых канкрэтных мерапрыемствах, якія мы намячаем у разьвіцьці гаспадаркі, бо мы з вамі аб гэтым ужо шмат гаварылі, я перайду і каротка спынюся на тых галоўнейшых задачах, якія зараз паўсталі перад намі.

Даны этап нашага разьвіцьця вымагае ад партыі вялікай напружанасьці сіл, маналітнасьці і загартаванасьці яе радоў. Таму і паўстала перад намі неабходнасьць ачысьціць свае ўласныя рады ад усяго таго, што перашкаджае рухацца наперад, што тармазіць справу сацыялістычнага будаўніцтва. Мы зараз распачалі работу па чыстцы партыі, каб усіх тых, што разлажыліся, абураваціліся і ня здольны весьці за сабою масы па шляху вялікага будаўніцтва, выкінуць з партыі.

Узмацненьне тэмпу гаспадарчага разьвіцьця вымагае вялікай творчай ініцыятывы рабочых мас, усямернага падтрыманьня на доўгі тэрмін таго парыву і энтузіязму рабочых, з якім яны ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва. Пытаньні ўздыму вытворчасьці працы, палепшаньня якасьці прадукцыі, эканомія сабекошту—павінны стаяць у асяродку нашай увагі.

Разгортваць на вёсцы калектывізацыю, разьвіваць сацыялістычны сэктар у сельскай гаспадарцы, ахопліваць шырэй бядняцка-серадняцкія масы вытворчым каапэраваньнем—вось асноўнае і галоўнае ў рабоце на вёсцы. Рабочыя арганізацыі праз шэфства, праз выкарыстаньне ўсіх іншых формаў і мэтадаў работы павінны больш, чым дагэтуль, памагаць у рабоце на вёсцы.

Мы будзем новыя фабрыкі і заводы на сродкі, якія здабываем унутры краіны, аб гэтым добра ведае кожны рабочы. І тут, бязумоўна, вялікае значэньне адыгрывае распаўсюджваньне тых дзяржаўных пазык, якія выпушчаліся нашым урадам. Мы па нашай Менскай акрузе ў справе распаўсюджваньня 2-й пазыкі індустрыялізацыі **стаімо на першым месцы ў СССР.** Але гэта далёка ня ўсё. Трымаць пазыку да тэрміну,на які яна выпушчана, кожны з тых працоўных, які яе купіў, вось чаго мы павінны дабівацца, вось аб чым мы сёньня павінны гаварыць.

Наша Менская акруговая партарганізацыя паставіла перад сабой задачу выканаць тое, што прыпадае на акругу па пяцігодцы ў тэрмін і з перавышэньнем. Мы спадзяемся, што наша арганізацыя, разам з рабочай клясай, гэта зробіць.

## ПРАЛЕТАРСКІ АДКАЗ ТЫСЯЧ

Спрэчкі па дакладу тав. **Славінскага** абярнуліся ў грандыёзную дэманстрацыю пратэсту супроць захопніцкіх плянаў і падрыхтоўкі буржуазіі да нападу на СССР.

На заклік партарганізацыі рабочая кляса вуснамі сваіх прадстаўнікоў, выступаўшых на сходзе, дала просты, канкрэтны пралетарскі адказ.

— Мы з партыяй! Мы зробім усё, што вымагаецца задачамі па ажыцьцяўленьні лініі партыі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва! Мы дапаможам партыі пасылкаю ў яе рады нашых лепшых перадавых таварышоў!

Рабочы заводу **«Камунар», які працуе на вытворчасьці 39 год, тав. Аўгусьцянак,** выступіўшы першым на сходзе, коратка заявіў:

— Рабочыя разумеюць цяжкасьці, якія стаяць на шляху сацыялістычнага будаўніцтва перад камуністычнай партыяй. Таму мы, **старыя рабочыя** заводу «Камунар» **у колькасьці 21 чал.** уступаем у рады партыі.

Бура, сапраўдная бура аплёдысмэнтаў, пакрывае выступленьне тав. Аўгусьцяняка.

— Рабочая кляса,—кажа **рабочы Дзяржбуду тав. Рэцкі**—пільна сочыць за ўсімі тымі падзеямі, якія адбываюцца ў капіталістычных краінах. У выпадку нападу на СССР з боку капіталістычных дзяржаў нас зьнянацку не застануць. Мы гатовы кожную хвіліну спаткаць і адбіць ворага!

— Мне,—працягвае **тав. Рэцкі,**—група старых рабочых **у ліку 21 чалавека** даручыла перадаць партарганізацыі, што яны ўступаюць у партыю. Мы ідзем у партыю замест тых, што выкінуты ёю з сваіх радоў, як нягодны непатрэбны элемэнт. Гэта група нашых рабочых, якія ўступаюць сёньня ў партыю, зможа вынесьці ўсе цяжкасьці, мы станем сапраўднымі бальшавікамі!

Тав. **Бяркоўскі** ад імя рабочых **1-й дзяржаўнай друкарні,** перадаючы **заявы 6 старых** рабочых аб уступленьні ў партыю, сказаў:—Мы, рабочыя **кляса** ў кожны момант гатовы пакінуць варштат і ўзяць у рукі стрэльбу, стаўшы дружна, як адзін, на абарону нашае пралетарскае бацькаўшчыны.

А тав. **Гаўрылюк** ад рабочых **Эльводу** перадаў сьпіс **8 перадавых пралетараў,** якія падалі заявы аб уступленьні ў рады партыі.

— Мы сёньня адкрылі новую фабрыку і адразу-ж пасьля адкрыцьця прышлі сюды запоўніць нашу партыю,,—кажа ад імя рабочых **Меншвэю тав. Гахштэйн,**—што мы ў сваёй штодзённай рабоце ні на крок не адступім ад лініі партыі. Мы, перайшоўшы працаваць на новую фабрыку, прыложым усе сілы, каб яшчэ больш палепшыць якасьць прадукцыі, патаніць яе сабекошт. Мы пасылаем у **рады партыі нашых двух перадавых лепшых рабочых.**

Другі рабочы **Меншвэю** тав. **Сарокін** у сваім выступленьні заявіў:

— На падрыхтоўку буржуазіі да новых войн, мы адкажам яшчэ большай згуртаванасьцю вакол лёзунгу і задач нашага кіраўніка камуністычнай партыі. Мне даручылі нашы рабочыя перадаць тут, што **яны высоўваюць пытаньне перад урадам і настойваюць на неабходнасьці выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі.** Нашы рабочыя па папярэдняй падпісцы **падпісаліся ўжо на 2.000 рублёў.**

**Тав. Восік,** рабочы заводу **«Камунар»,** сказаў:—Мы, рабочыя калектыву «Камунар», просім партыю неадкладна паставіць перад урадам пытаньне **аб як мага хутчэйшым выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі.**

— Тут мы чулі аб тым,—кажа **рабочы-будаўнік т. Новікаў,**—што буржуазія рыхтуе напад на нашу краіну. Мы на гэта адкажам узмацненьнем абароназдольнасьці краіны, узмацненьнем тэмпу гаспадарчага і культурнага разьвіцьця СССР. Мы сваім патрабаваньнем і дружнай падпіскай на 3-ю пазыку індустрыялізацыі павялічым фонды для сацыялістычнага будаўніцтва. **Нашы рабочыя дадаткова падпісаліся на 2-ю пазыку індустрыялізацыі на суму 17 тысяч руб.,** яны на сваім сходзе ўхвалілі хадайнічаць перад урадам аб выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

## НЕВЫЧАРПАЛЬНЫЯ РЭЗЭРВЫ

Масы... Багаты рабочыя масы на жыватворчую людзкую сілу, на сілы бадзёрасьці і рэвалюцыйнай сьвядомасьці...

1919 год... Белагвардзейшчына пры падтрыманьні сусьветных капіталістых абсела і сьціснула ў вузкае кола сэрца рэвалюцыі—Чырвоную Маскву. Рабочыя масы на гэта адказалі пасылкаю ў рады партыі тысяч сваіх перадавых таварышоў, папоўнілі рады барацьбітоў за заваёвы Кастрычніка.

Памёр творца бальшавіцкае партыі Ул. Іл. Ленін... Рабочая кляса адказала на вялікую страту партыі і сусьветнага пралетарыяту масавым уступленьнем у партыю. Пасьля жалобных дзён 1924 году партыя прыняла ў свае рады новыя кадры пралетараў.

У 10-ю гадавіну Кастрычніка тысячы перадавых пралетараў сталі ў рады свайго авангарду...

І зараз...

Зараз, калі сусьветны капіталізм шалёным тэмпам падрыхтоўвае напад на СССР, калі наша партыя намеціла грандыёзныя, нябачныя нідзе ў сьвеце мерапрыемствы па сацыялістычным будаўніцтве, рабочыя на гэта далі адказ канкрэтнай справай—масавым уступленьнем у рады партыі.

Рабочыя ідуць у партыю... Партыя з гэтых багатых невычарпальных рэзэрваў чэрпае новыя сьвежыя сілы...

Гэтыя сілы ў радох сінаблюзай пралетарскай масы штодзённа за варштатамі, над цяглянымі мурамі, там, дзе сталёвымі лёгкімі глыбока ўздыхаюць машыны, там гэтыя рабочыя сваёй штодзённай напружанай работай, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі рухаюць уперад справу сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэтых людзей мы можам бачыць на пасяджэньнях фабкомаў, на вытворчых нарадах, укладаючы сваю практыку, усе веды ў справу вялікага будаўніцтва. Іх шмат... Толькі блізарукі ня бачыць гэтых дзесяткаў, сотняў і тысяч людзей з рэзэрваў, гаворачы: «няма каго вербаваць у партыю». Гэта гаворыць і так здаецца толькі таму, хто стаіць далёка ад мас! Рэзэрвы багатыя... Патрэбна толькі практычная работа, каб зрабіць зрух. І некаторыя партарганізацыі, ячэйкі гэты зрух зрабілі. Мы сёньня сьведкі такога факту, калі ў Фрунзаўскую арганізацыю да шасьці дзесяткаў перадавых з вялікім вытворчым стажам рабочых падалі заявы аб уступленьні ў партыю...

Гэтыя дзесяткі праз сваіх прадстаўнікоў з трыбуны партыйнага сходу аднадушна, проста і горача сказалі:

— Мы ідзем у партыю дапамагчы ў перамозе тых цяжкасьцяй, якія сустракае на шляху будаўніцтва сацыялізму!..

— Мы, прышоўшы ў партыю, пойдзем па тым простым і ясным шляху, які намеціла ў сваёй генэральнай лініі партыя!..

— Мы разам з усёй партыяй пераможам і перанясем усе цяжкасьці!..

І сапраўды, глянеш на твары гэтых пралетараў і бачыш тую вялікую сілу, з якой ня страшны цяжкасьці...

Іх было ўчора 58...

Сёньня і заўтра іх будуць сотні і тысячы.

Хто-ж гэтыя 58 фрунзаўцаў?

## АБЛІЧЧА 58

**Рабочыя будаўнікі**—т. т. **РЭЦКІ**—вытворчы стаж 17 гадоў; **ГАРАМАЎ**—на вытворчасьці 7 гадоў; **КУЛА**—таксама 7 г.; **ГАРДОН**—10 г.; **КАНТАРОВІЧ**—12 г.; **БОКУЦ**—11 г.; **ПАЛІЎКІН**—19 г.; **ШАПІЛАЎ**—былы чырвонаармеец—20 г.; **САЧУК**—12 г.; **АЛІМАЎ**—9 г.; **ДОЎНАР**—18 г.; **ІЎКІНА**—14 г.; **ВІНЭР**—19 г.; **АНДРЭЙЧУК**—10 г., у свой час служыў у Чырвонай арміі; **РАЙСКІ,** таксама былы чырвонаармеец, на вытворчасьці 16 год; **ГРЫГАРЧУК**—19 г.; **АЎСКЕР**—17 г.; **БУЙНІЦКАЯ**—6 г.; **МІКАЛАЙЧЫК**—18 г.; **ЖАЧАН** і **ЗАНІС.**

**Рабочыя заводу «Камунар»:** т. т. **ЦЫЛЬМАН, ШЫМАС, МАСКАЕЎ** — усе трое на вытворчасьці працуюць па 12 год; т. **ДРАБКІН** на вытворчасьці 13 г., **РОЛЬБЭЙНС**—14 г.; **МІНКІН**—14 г.; **ЗІЛЬБЭРТ**—15 г.; **ГАРАДЗЕНСКІ**—15 г.; **ЯХНЭС Д.** — 16 г.; **КРАВЕЦ**—17 г.; **АСС**—17 г.; **ГОЛЬДБЭРГ**—19 г.; **НАВАЛЬСКІ**—20 г.; **ВОСІК** — 24 г.; **КРАСІНКАЎ** — 25 г.; **АЎГУСЬЦЯНЯК**—39 г.; **ПАТАПАЎ**—2 г.; **САЛЬНІКАЎ**—3 г.; **ШАБАН**—6 г.; **САГАЛЬЧЫК**—9 г.; **МІХАЛЬЧУК**—7 г.

**Рабочыя Эльводу:** т. т. **ХАМЯКОЎ** на вытворчасьці 11 год.;**ГАЎРЫЛЮК**—18 г.; **КЛІМОВІЧ**—14 г.; **РАК**—28 г.; **ПАНО**—10 г.; **КРУЦКО**—10 г.; **ШЧАСНЫ**—23 г.; **ШПАК**—17 г.

**Рабочыя друкары:**—т. т. **БЯРКОЎСКІ** па вытворчасьці 22 гады; **ЛІЎШЫЦ**—12 г.; **ЭПШТЭЙН**—14 г.; **БАБРАЧУК**—30 г.; **КАГАН**—12 г.; **КАРП**—15 г.

**Рабочыя Меншв

# Савецкі Саюз патрабуе ад кітайскіх улад:

## — НЕАДКЛАДНАЙ АДМЕНЫ ЎСІХ НЕЗАКОННЫХ РАСПАРАДЖЭНЬНЯЎ НА К.-УСХ. ЧЫГУНЦЫ

## — ВЫЗВАЛЕНЬНЯ ЎСІХ АРЫШТАВАНЫХ САВЕЦКІХ ГРАМАДЗАН

### АД НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ПА ЗАМЕЖНЫХ СПРАВАХ

13-га ліпеня паверанаму на справах Кітайскай рэспублікі ўручана была наступная нота за подпісам нам. Наркома замежных спраў тав. **Карахана:**

«Масква, 13 ліпеня 1929 г.

**ПАНУ СЯ ВЭЙ-СУН,**
**паверанаму па справах Кітайскай рэспублікі**

Пан паверані ў справах!

Па даручэньні ўраду Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, прашу паведаміць Мукдэнскаму ўраду і Нацыянальнаму ўраду Кітайскай рэспублікі ў Нанкіне наступнае:

Паводле вестак, атрыманых урадам СССР, 10 ліпеня, раніцаю, кітайская улада арабіла налёт на Кітайска-Усходнюю чыгунку і захапіла тэлеграф К.-У. чыгункі па ўсёй лініі, перарваўшы тэлеграфныя зносіны з СССР, закрыла і апячатала без тлумачэньня прычын гандлёвае прадстаўніцтва СССР, а таксама аддзяленьні Дзяржгандлю, Тэкстыльсындыкату, Нафтасындыкату і Саўгандльфлёту. Потым дубань чыгункі (старшыня праўленьня К.-У. чыг.) Люй Чжун-хуан прад'явіў кіраўніку К.-У. чыг. Емшанаву патрабаваньне перадаць кіраўніцтва чыгункі асобе, назначанай дубанем. Калі кіраўнік чыгункі г. Емшанаў адмовіўся выканаць гэтае незаконнае патрабаваньне, якое зьяўляецца самым грубым парушэньнем згоды аб часовым кіраваньні К.-У. чыг., заключанай у горадзе Пекіне 31 мая 1924 году, а таксама згоды паміж урадам СССР і ўрадам аўтаномных трох усходніх правінцый Кітайскай рэспублікі, заключанае ў Мукдэне 20 верасьня 1924 г., ён быў адхілены ад выкананьня сваіх абавязкаў, таксама, як і намочнік кіраўніка чыгункі Эйсмонт. Пры гэтым абодвы яны былі заменены асобамі, назначанымі дубанем. Начальнікі служб цягі, руху і іншыя асобы, па загаду таго-ж дубаня, былі адхілены і заменены, галоўным чынам, расійскімі белагвардзейцамі. Па ўсёй лініі К.-У. чыг. былі закрыты і разгромлены прафэсіянальныя і каапэрацыйныя арганізацыі рабочых і служачых чыгункі, а таксама былі зроблены вобыскі і арышты, пры чым было арыштавана больш 200 грамадзян СССР, рабочых і служачых чыгуначнікаў. 60 савецкіх грамадзян, у тым ліку Емшанаў і Эйсмонт, ужо высланы з межаў Кітая. Адначасова атрыманы весткі аб скапцэнтраваньні ўзброй савецкай граніцы манчжурскага войска, якое прыведзена ў баявую гатоўнасьць і прасунута да самай граніцы. Паводле вестак, разам з манчжурскім войскам ля меж СССР размешчаны і расійскія белагвардзейскія атрады, якія манчжурскае камандваньне мае намер перакінуць на савецкую тэрыторыю.

Вышэйпаказаныя дзеяньні прадстаўляюць сабою самае відавочнае і самае грубае парушэньне простых і нядвухсэнсоўных пастаноў—існуючых дагавораў паміж СССР і Кітаем, і гэтыя парушэньні не становяцца менш абураючымі ад таго, што дубань чыгункі ў сваёй абвестцы сам спасылаецца на абавязак прадстаўнікоў бакоў на К.-У. чыг. строга захоўваць дагаворы, спрабуючы замаскаваць гэтай спамылкай свае яўна незаконныя дзеяньні.

Дубань у сваёй абвестцы спасылаецца на загад, адданы ім кіраўніку Емшанаву адносна правядзеньня ў жыцьцё цэлага раду патрабаваньняў кітайскага боку, якія датычаць парадку кіраваньня чыгункай. Аднак, кіраўнік чыгункі зьяўляецца выканаўчым органам усяго праўленьня ў цэлым, і ня можа выконваць загаду дубаня або яго намесьнікаў, калі яны ня выходзяць ад самога праўленьня за подпісамі старшыні і яго таварыша, як таго патрабуе артыкул 1-шы п. 6 мукдэнскае згоды 1924 году. Самае спасыланьне на невыкананьне кіраўніком якіхсьці індывідуальных распараджэньняў дубаня толькі пацьвярджае незаконны характар дзеяньняў гэтага апошняга.

Згоды 1924 г. устанаўляюць зусім пэўны парадак урэгуляваньня ўсіх спрэчных пытаньняў, якія датычаць чыгункі. Згодна артыкулу 6-га згоды ад 31 мая 1924 г. і артыкулу 1 і 11 мукдэнскае згоды, **«усе пытаньні, па якіх праўленьне ня можа прыйсьці да згоды, павінны быць пераданы на разгляд урадаў бакоў, што дагаварваюцца, для спрэвядлівага і прыяцельскага вырашэньня».** Кожны з бакоў мае, такім чынам, поўную магчымасьць паставіць перад другім бокам любое пытаньне ў зусім законным і нармальным парадку і дабівацца ажыцьцяўленьня сваіх патрабаваньняў. Аднак, кітайскі бок і ў гэтым выпадку, як і ў некаторых папярэдніх выпадках, як, напрыклад, пры захваце тэлефоннай станцыі, аддаў перавагу шляху аднабаковых і незаконных патрабаваньняў, якія ня толькі парушаюць, але і апракідваюць дзейнічаючыя паміж СССР і Кітаем дагаворы.

Канстатуючы, што паказаныя вышэй дзеяньні дубаня К.-Ус. чыгункі прадстаўляюць грубае парушэньне існуючых паміж СССР і Кітаем дагавораў, урад СССР заяўляе самы рашучы пратэст з повараду гэтых дзеяньняў і зьвяртае ўвагу мукдэнскага ўраду і нацыянальнага ўраду Кітайскай рэспублікі на надзвычайную сур'ёзнасьць становішча, якое створана гэтымі дзеяньнямі.

Саюзны ўрад даваў ня раз довады свайго міралюбства і прыяцельскіх адносін да Кітаю і да той барацьбы, якую кітайскі народ вёў і вядзе за зьніпчэньне няроўных дагавораў і аднаўленьне сувэрэнітэту Кітая. Урад СССР быў першым урадам, які заключыў з Кітаем дагавор на пачатках роўнасьці і пашаны сувэрэнітэту Кітая. Урад СССР сам, па сваёй ініцыятыве, яшчэ ў 1919 годзе зьвярнуўся да кітайскага народу з дэклярацыяй, у якой заявіў аб сваёй гатоўнасьці зьнішчыць усе няроўныя дагаворы, заключаныя паміж Кітаем і царскай Расіяй. У дагаворы 1924 г. гэтыя свае заявы ўрад СССР рэалізаваў. Урад СССР добрахвотна адмовіўся па карысьць Кітая ад канцэсій у Цяньцзіне і Ханькоу. Ён добрахвотна адмовіўся ад консульскай юрысдыкцыі і экстэрытарыяльнасьці для сваіх грамадзян у Кітаі. Ён па ўласнай-жа ініцыятыве адмовіўся ад боксэрскай кантрыбуцыі, перадаўшы яе на справу асьветы кітайскага народу. Нарэшце, ён таксама добраахвотна адмовіўся ад усіх тых прывілеяў, якія былі прадстаўлены Расіі на К.-Ус. чыг., а іменна ад права мець у Кітаі сваё войска, паліцыю, суд і ад іншых ваенна-адміністрацыйных функцый, якія да таго былі прэрагатывай расійскіх улад на К.-Ус. чыг. і ва ўсёй паласе адчуджэньня гэтай чыгункі. Гэтае адмаўленьне ад усіх прывілеяў, якімі карыстаюцца да гэтага часу чужаземныя дзяржавы, з якімі Кітай знаходзіцца ў нармальных адносінах было праяўленьнем сацыялістычнага характару замежнай палітыкі савецкае дзяржавы. Заключэньне дагавору 1924 году паміж СССР і Кітаем было сустрэчана з вялікім спачуваньне ва ўсіх частках Кітая, бо гэты дагавор упяршыню ажыцьцяўляе прынцып роўнасьці бакоў і поўнага сувэрэнітэту Кітая.

З паказанага вышэй вынікае, што, калі кітайская ўлада мела якія-небудзь прэтэнзіі ў адносінах да ўстаноўленага на чыгунцы рэжыму, дзеяньня паасобных прадстаўнікоў СССР на чыгунцы, або нават у адносінах, устаноўленых дагаворамі праў на К.-Ус. чыг., аж да скарачэньня тэрміну дагавору і датэрміновага выкупу К.-Ус. чыгункі, то ўлада мела поўную і прадугледжаную дагаварамі магчымасьць у законным парадку прад'явіць ураду СССР любую сваю прэтэнзію.

Саюзны ўрад канстатуе, што ў пытаньнях, якія датычаць К.-Ус. чыг., ён няазьменна праяўляў гатоўнасьць да прыяцельскага ўрэгуляваньня любога спрэчнага пытаньня.

Паказаную вышэй палітыку мірнага і прыяцельскага вырашэньня ўсіх спрэчных пытаньняў і палітыку пашаны да сувэрэнных праў Кітая, якая зьяўляецца карэннем адмаўленьнем асноў імпэрыялістычнай палітыкі буржуазных дзяржаў, пяперашнія кітайскія ўлады схільны, відавочна, расцэньваць, не як палітыку, якая вынікае з самой прыроды савецкай улады, а як праяўленьне яе слабасьці. Відавочна, іменна з гэтае прычыны кітайская ўлада дазваляе сабе рад груба-гвалтоўных і правакацыйных дзеяньняў у адносінах СССР, злоўжываючы яго міралюбствам. Саюзны ўрад вымушаны таму напомніць кітайскім уладам, што ён мае выстарчальныя сродкі, патрэбныя для таго, каб абараніць законныя правы народаў СССР ад якіх бы там ні было гвалтоўных замахаў.

Застаючыся верным сваёй мірнай палітыцы, Саюзны урад, ня гледзячы на гвалтоўныя і правакацыйныя дзеяньні кітайскіх улад, яшчэ раз выказвае гатоўнасьць уступіць з Кітаем у перагаворы па ўсім комплексе пытаньняў, зьвязаных з К.-Ус. чыг. Такія перагаворы магчымы, аднак, толькі пры ўмове неадкладнага вызваленьня арыштаваных грамадзян СССР і скасаваньні ўсіх незаконных дзеяньняў кітайскіх улад.

У адпаведнасьці з гэтым, Саюзны ўрад прапануе:

**1) Склікаць неадкладна канфэрэнцыю для ўрэгуляваньня ўсіх пытаньняў, зьвязаных з К.-Ус. чыг.;**

**2) Кітайская ўлада неадкладна скасоўвае ўсе самачынныя дзеяньні ў адносінах К.-Усх. чыг.;**

**3) Усе арыштаваныя савецкія грамадзяне неадкладна вызваляюцца і кітайская ўлада спыняе ўсе прасьледваньні і ўціск у адносінах як савецкіх грамадзян, так і савецкіх устаноў.**

**Саюзны ўрад прапануе мукдэнскаму ўраду і нацыянальнаму ўраду Кітайскай рэспублікі ўзважыць тыя сур'ёзныя вынікі, якія будуць мець адхіленьні гэтае прапановы СССР.**

**Саюзны ўрад заяўляе, што ён у працягу трох дзён будзе чакаць адказу кітайскага ўраду на паказаную вышэй прапанову, і папярэджвае, што, у выпадку, неатрыманьня здавальняючага адказу, ён будзе вымушаны зьвярнуцца да іншых сродкаў абароны законных праў СССР.**

Прымеце і інш.

КАРАХАН.

**УВАГА РЭДАКЦЫІ.** Нота друкуецца ў скарочаным выглядзе

## Супроць бандыцкага налёту на К.-Усх. чыгунку

### МАГУТНАЯ ХВАЛЯ ПРАТЭСТУ ПРАЦОЎНЫХ СССР

МАСКВА, 15. У нядзелю, у парку Культуры і Адпачынку адбыўся грандыёзны мітынг пратэсту супроць разбойніцкага налёту на Кітайска-Усходнюю чыгунку.

У мітынгу ўдзельнічала звыш 8.000 рабочых буйнейшых заводаў Масквы, служачых і чырвонаармейцаў. Пасьля невялікага дакладу старшыні МГСПС тав. Скрыеўскага з прамовамі выступілі рабочыя раду маскоўскіх прадпрыемстваў, якія патрабавалі рашучых мер супроць кітайскіх генэралаў, а таксама яшчэ большага напружаньня ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Бурнымі апладысмэнтамі была спаткана заява дэмабілізаванага чырвонаармейца, будаўнічага рабочага Кажачанкова, які заявіў, што ён гатоў у любую хвіліну ўступіць у рады Чырвонай армії для абароны Савецкага Саюзу.

Ва ўхваленай рэзалюцыі гаворыцца **—ня хочам вайны. Гэта даводзіць міралюбівая нота і палітыка савецкага ўраду. Але ўсяму бывае мяжа. Кітайскія калчані, дзянікінцы і ўрангелі пралічацца. Праз галовы кітайскіх генэралаў зьвяртаемся да кітайскае рабочае клясы і сялянства з заклікам асадзіць бандытаў і эксплёататараў. Наша сіла ў братэрскім саюзе кітайскага народа з народамі СССР. У нас з вамі агульныя ворагі—гэта кітайскія фашыстыя, генэралы, памешчыкі, ліхвяры і банкіры. Патрабуем ад савецкага ўраду самых рашучых мер, каб ня спыняючыся ні перад чым пакласьці канец бандыцкаму свавольлю і гвалту.**

**Для падмацаваньня нашага ўльтыматума кітайскім генэралам патрабуем неадкладнага выпуску 3-е пазыкі індустрыялізацыі. Узмоцнім выкананьне пяцігодкі, павысім прадукцыйнасьць працы, палепшым якасьць прадукцыі. За ўмацаваньне Чырвонай армії—аплоту абароназдольнасьці СССР. Па першым закліку савецкай улады, усе як адзін, са зброяй у руках выступім на абарону Савецкага Саюзу.**

У той-жа дзень аналёгічныя рэзалюцыі ўхвалены на шматтысячных мітынгах працоўных Масквы, на Ленінскіх гарах, у садзе імя Мандэльштама і інш. Мітынгі пратэсту супроць бандыцкага налёту на К.-Ус. чыгунку адбыліся таксама ў Хабараўску, Новасібірску, Іркуцку, Казані, Астрахані і іншых гарадох.

## Голас абурэньня пралетараў г. Менску

Наглы захват кітайскай ваеннічнай і расійскімі белагвардзейцамі Кітайска-Усходняй чыгункі і разгром савецкіх устаноў выклікаў рэзкі выбух абурэньня сярод пралетараў Менску.

Так рабочыя і служачыя **друкарні і рэдакцыі «Зьвязда»** заявілі:

**— Мы разглядаем і ацэньваем акт кітайскіх улад, як наглае імкненьне выклікаць вайну і жаданьне сарваць мірную палітыку і мірнае будаўніцтва сацыялізму СССР.**

**Выказваючы энэргічны пратэст супроць правакацыі кітайскай контр-рэвалюцыі мы патрабуем неадкладнага вызваленьня ўсіх арыштаваных савецкіх грамадзян, ачышчэньня ўсіх савецкіх устаноў і неадкладнага ўводу манчжурскіх войск ад меж Савецкага Саюзу.**

**Мы запэўніваем наш урад, што змагаючыся на гаспадарчым фронце за пераможнае будаўніцтва сацыялізму і ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну, мы адначасова пільна сачымо за дзеяньнямі нашых ворагаў і заўсёды гатовы даць ім рашучы адпор.**

**Мы заяўляем, што вайны ня хочам, але калі на нас нападуць, дык усе, як адзін, станем на абарону нашай рэспублікі, на абарону заваёў Кастрычнікавай Рэвалюцыі.**

***

Мы, рабочыя і служачыя **Менскай фабрыкі абутку** катэгарычна пратэстуем супроць дзеяньняў кітайскіх бандытаў, якія тэрарызуюць савецкіх рабочых і служачых, занятых мірнай работай на Кітайска-Усходняй чыгунцы.

— **Мы патрабуем ад нашага савецкага ўраду прыняцьця самых рашучых мер да абнаглеўшых бандытаў і заяўляем, што па першым закліку нашага рабоча-сялянскага ўраду, усе, як адзін, станем на абарону адзінай у сьвеце краіны пралетарскай дыктатуры.**

Прэч наймітаў — контр-рэвалюцыянэраў.

***

Агульны сход рабочых і служачых **чырвонаштандартнага заводу «Бальшавік»** заяўляе, што гэты новы акт наступленьня на савецкую краіну ёсьць чарговая спроба справакаваць пралетарыят СССР на вайну.

Але мы настолькі моцныя, што не паддамося на правакацыю нашых ворагаў. Мы паранейшаму будзем узмоцнена працаваць над узмацненьнем сацыялізму.

Адначасова мы патрабуем ад нашага ўраду прыняцьця мер да канчатковага спыненьня падобных абураючых бандыцкіх налётаў кітайскай ваеннічны.

**Рабочыя гарбарні «Бальшавік» заяўляюць, што гатовы ў любую хвіліну выступіць на абарону СССР.**

## Нота кітайскага ўпоўнаважанага у Маскве т. Карахану

### У ноце упоўнаважанага зазначаецца, што ён неадкладна пераклаў і адправіў тэлеграфам у Нанкін савецкую ноту

**МАСКВА, 15. Сёньня ўпоўнаважаны кітайскай рэспублікі Ся Вэй-сун прыслаў тав. Карахану ноту наступнага зьместу:**

**— Пан Народны Камісар! Маю гонар давесьці да Вашага ведама, што 14-га ліпеня, а 4 гадз. раніцы мне ўручана была Ваша нота ад 13-га ліпеня.**

**Неадкладна і асабіста прыступіўшы да перакладу ноты на кітайскую мову, я змог пры непарыўнай рабоце закончыць дакладны і поўны пераклад пад канец дня 14-га ліпеня і а 1 гадз. 30 мін. 15-га ліпеня здаць яго на маскоўскі тэлеграф ў адрас майго ўраду.**

**Ня маючы інструкцый на непасрэднія зносіны з мясцовым ўрадам трох усходніх правінцый Кітайскай рэспублікі, я прасіў тэлеграмай міністэрства аб перадачы ноты і ў Мукдэн. Копія расійскага тэксту Вашай ноты мною адпраўлена ў Нанкін поштаю.**

## Без удзелу прадстаўнікоў працоўных мас, варшаўскі зьезд зьяўляецца зьездам фашыстых, а не палякаў з-заграніцы

### ВАРШАЎСКІ ЗЬЕЗД ЯШЧЭ МОЖА ВЫПРАВІЦЬ ПАМЫЛКУ ВАРШАЎСКАГА АРГАНІЗАЦЫЙНАГА КАМІТЭТУ

### Дэклярацыя польскай дэлегацыі СССР

КІЕЎ, 12. У польскім рабочым клюбе адбылася супольная нарада дэлегацый зьездаў працоўных палякаў ад БССР, УССР і РСФСР, абраных на варшаўскі кангрэс.

У нарадзе ўдзельнічалі шматлікія прадстаўнікі польскіх рабочых і польскай працоўнай інтэлігенцыі Кіеву. Пастаноўлена стварыць адзіную дэлегацыю, якая прадставіць на варшаўскім кангрэсе польскія працоўныя масы усяго СССР. У прэзыдыум аб'яднаной дэлегацыі абіраецца т. т. Лясьнеўскі (старшыня), Руткоўскі, Скаўронка (нам. старшыні) і Пшыбышэўскі (сакратар).

Нарада аднагалосна пастанавіла зьвярнуцца да варшаўскага арганізацыйнага камітэту па скліканьні кангрэсу з наступнай тэлеграмай:

**«Усерасійскі, Усебеларускі і Усеукраінскі зьезды прадстаўнікоў польскіх працоўных мас СССР апрэтэставалі вашу пастанову аб недапушчэньні нашых дэлегацый на зьезд, прызналі яе нічым не абгрунтаванай і патрабавалі перагляду пытаньня. Да гэтага часу вы нам не адказалі. У той-жа час польскія консулы ў СССР, спасылаючыся на вашу першую пастанову адмаўляюцца выдаць візы на ўезд у польскую рэспубліку.**

**Аб'яднаная дэлегацыя ад імя 800.000 польскіх рабочых, сялян і польскай працоўнай інтэлігенцыі СССР настойліва патрабуюць неадкладнага адказу на пратэст рэспубліканскага зьезду».**

Нарадаю ўхвалена дэклярацыя, у якой, паміж іншым, гаворыцца:

«СССР—адзіная краіна, дзе выбар на зьезд зарубежных палякаў адбываецца на сапраўды дэмакратычных пачатках пры ўдзеле шырокіх мас працоўных. Галоўнай задачай нашай дэлегацыі зьяўляецца выказваньне з трыбуны зьезду праўды аб СССР, аб сапраўдным становішчы і аб сапраўдных імкненьнях польскіх рабочых і сялян савецкай рэспублікі. Зьезд зарубежных палякаў скліканы пад лёзунгам «нацыянальнага адзінства».

«Нацыянальнае адзінства», г. зн. адзінства капіталістых і рабочых, памешчыкаў і сялян-бедняко ў—гэта фальшывая фраза, якая прыкрывае эксплёатацыю буржуазіяй народных мас. Нацыянальнае прыгнечаньне неадлучна ад капіталістычнай эксплёатацыі і зьяўляецца адным з самых выпрабаваных сродкаў яго ўзмацненьня.

Дэлегацыя заяўляе, што польскае працоўнае насельніцтва Савецкага Саюзу ня мае патрэбы ў ахове сваіх нацыянальных праў і ў падтрыманьні з боку буржуазіі і памешчыкаў Польшчы.

У аснове канстытуцыі як СССР так і савецкіх рэспублік, што ўваходзяць у яго, ляжыць непахісны прынцып поўнае нацыянальнае роўнасьці, які забясьпечвае вольнае гаспадарчае і культурнае разьвіцьцё ўсіх нацыянальнасьцяй, што яго насяляюць.

Пералічыўшы дасягненьні працоўных у Савецкім Саюзе, дэклярацыя гаворыць:

«Падняцьце культурнага ўзроўню польскага працоўнага насельніцтва СССР, разьвіцьцё культуры мас на іх роднай мове, дасягаецца побач з іншымі нацыянальнасьцямі ў самым цесным з імі супрацоўніцтве. У імя міжнароднай салідарнасьці ўсіх працоўных колькасна больш мацнейшых, дапамагаць нацыянальнасьцям больш слабым разьвіваць сваю культуру».

Паказаўшы на дасягненьні Савецкага Саюзу ва ўсіх галінах будаўніцтва, адзначыўшы небясьпеку вайны, што пагражае СССР, дэклярацыя заяўляе:

**«У выпадку нападу імпэрыялістых на СССР, польскія рабочыя і сяляне поплеч з усімі працоўнымі Саюзу будуць абараняць СССР, як сваю сацыялістычную бацькаўшчыну».**

### Зьезд закардонных палякаў фактычна праваліўся сярод дэлегацый-пачаліся непаразуменьні

#### Рад дэлегацый, у тым ліку частка амэрыканскай і бэльгійскай, адсутнічаюць

(Начное радыё)

**ВАРШАВА, 15. Учора, у залі пасяджэньняў сойму адкрыўся зьезд закардонных палякаў. Заля ўпрыгожана сьцягамі ўсіх дзяржаў адкуль прыехалі дэлегаты. Дэманстрацыйна астаўлены месцы, на якіх вывешаны плякаты, што гэтыя месцы былі прызначаны для дэлегатаў СССР і Літвы. На адкрыцьцё зьезду прыбыў прэзыдэнт Масьціцкі.**

**Ад першага-ж пасяджэньня сярод дэлегацый пачаліся непаразуменьні... У сувязі з гэтымі непаразуменьнямі рад арганізацый адмовіўся прымаць удзел на зьезьдзе. Так, напрыклад, на зьезд не прыбыла нацыянал-дэмакратычная частка дэлегацыі з Амэрыкі, адсутнічае частка бэльгійскай дэлегацыі.**

**Друк ня крыецца, што зьезд фактычна праваліўся.**

### Англія паслала запрашэньні савецкаму ўраду прыслаць свайго прадстаўніка ў Лёндан

(Начное радыё)

**ЛЁНДАН, 15. Агэнцтва Рэйтэр паведамляе: «Выступаючы ў парляманце, Гендэрсон заявіў, што савецкаму ўраду перадана запрашэньне праз нарвэскі ўрад паслаць адказнага прадстаўніка савецкага ўраду ў Лёндан для абмеркаваньня працэдуры, якая забясьпечыць урэгуляваньне яшчэ нявырашаных пытаньняў у найхутчэйшы тэрмін.**

**Гэта заява Гендэрсона была спаткана аплёдысмэнтамі на лаўках рабочай партыі.**

## Самалёт „Крыльлі саветаў" у Бэрліне

БЭРЛІН, 14. У суботу, увечары, у клюбе савецкай калёніі, адбылося ўшанаваньне ўдзельнікаў эўрапэйскага пералёту на самалёце «Крыльлі саветаў». Калі слова было прадстаўлена Громаву, яго спаткалі доўгай бурнай авацыяй. Громай сказаў:

— Пералёт быў распачаты пры вельмі цяжкіх умовах, туман, нізкія воблакі, дажджы і перагрузка самалёту. Калі мы праляцелі 200 кілёмэтраў, надвор'е пачало паляпшацца, але ўзьняўся сустрэчны вецер, які замаруджваў хуткасьць палёту. Самалёт моцна кідала з боку ў бок, але ўсё-ж я адчуваў сябе значна лепш за маіх пасажыраў, якія цярпелі. 10 з паловаю гадзін прасядзеў я ня сходзячы з месца, бяз усякай страхвы, бо таварышы ня былі ў стане перадаць мне яе. Толькі калі мы дасягнулі Бальтыцкага мора, самалёт перастала качаць і наша публіка пачала пакрыху аджываць. Наш эўрапэйскі пералёт толькі пачынаецца, але цяжкі этап, які намі пройдзены, служыць зарукаю таго, што «Крыльлі саветаў» пасьпяхова праробіць увесь маршрут. Адлёт «Крыльляў саветаў» у Парыж назначаны на аўторак.

«Бэрлінэр Тагэблят» піша, што савецкі самалёт, на якім ляцелі нямецкія ўдзельнікі пералёту у Штраззэмундзе, ня ў чым ня ўступае таму, што мы прывыклі бачыць на нямецкіх пасажырскіх самалётах.

## На парозе IV кварталу

Народная гаспадарка СССР уступіла ў апошні—IV—квартал бягучага гаспадарчага году. Гаспадарчыя вынікі гэтага кварталу павінны канчаткова вызначыць колькасныя вынікі ўсяго гаспадарчага году. Адэтуль—вялізная важнасьць тых асаблівых, выключных народна-гаспадарчых задач, якія ставяцца ходам разьвіцьця іменна ў гэтым апошнім квартале бягучага году.

Бясспрэчным зьяўляецца той факт, што ўсе мінулыя месяцы гаспадарчага году прайшлі ў абставінах напружаньня і вялікіх народна-гаспадарчых цяжкасьцяй. Найбольшага напружаньня цяжкасьці дасягалі, як вядома, у галіне заготавак сельска-гаспадарчых прадуктаў і ў галіне вытворчага забесьпячэньня гарадзкога працоўнага насельніцтва.

Асноўная задача, што стаіць перад намі ў IV квартале, заключаецца ў тым, каб дабіцца значнага зьніжэньня перанапружанасьці ва ўсіх рашаючых вузлох народнае гаспадаркі і тым самым—падрыхтаваць найбольш спрыяючыя ўмовы для барацьбы з гаспадарчымі цяжкасьцямі ў надыходзячым гаспадарчым годзе.

Гэтыя задачы прадугледжваюць у першую чаргу ўзмоцненую падрыхтоўку да васеньняй пасеўнай кампаніі, бо вынікі гэтай кампаніі ў значнай меры азначаюць гаспадарчую кан'юнктуру ў 1929-30 годзе.

Ужо цяпер зусім выявіліся папярэднія віды на ўраджай. Паводле даных аблку тав. **Андрэева**, плошча засеву збожжа сёлета папырылася на 15 проц., што павінна даць павялічэньне збожжавае прадукцыі ня менш, як на 1 міл. тон толькі на Паўночным Каўказе. Ёсьць даныя аб значным павялічэньні пасеўных плошчаў і ў іншых вытворчых сельска-гаспадарчых раёнах СССР. А паводле арыентыровачных, яшчэ дакладна не праверваных даных, агульны ўзровень збожжа ў гэтым годзе павінен перавысіць леташні прыблізна на 4,5—4,8 міл. тон. Такім чынам, у колькасных паказальніках сельскае гаспадаркі мы маем пэўны зрух у лепшы бок.

Адэтуль асаблівае значэньне хлебазагатовак. У IV квартале хлебазагатоўчая работа павінна стаць у цэнтры гаспадарчае работы ўсіх апэрацыйных і рэгулюючых загатоўчых арганізацый, а таксама і ўсёй грамадзкасьці.

Аднак, рэалізацыя новага ўраджаю ні ў якой меры не паслабляе баявых мерапрыемстваў па зьнішчэньні напружанага становішча на рынку вытворчых прадуктаў. Разгортваньне збожжавых рынкаў, узмацненьне мясцовага збожжавага звароту для здавальненьня мясцовых харчовых патрэб, у першую чаргу, патрэб бядняцкіх мас вёскі, прадстаўляе важнейшую задачу нізавых гаспадарчых арганізацый.

Ня менш баявыя задачы стаяць у IV квартале і перад прамысловасьцю. У галіне колькасных паказальнікаў мы значна пасунуліся наперад і справіліся з вялікімі заданьнямі бягучага году. У выніку вялікіх капітальных укладаньняў наша прамысловасьць павялічыла свой асноўны капітал. На працягу мінулых месяцаў гаспадарчага году пушчана ў ход 50 новых фабрык, заводаў і капальняў, прадукцыя якіх складае ў гэтым годзе да 115 міл. руб. Усё гэта паказвае на вялікія посьпехі мінулага пэрыяду.

Другі малюнак даюць якасныя паказальнікі работы прамысловасьці. Даныя аб майскай прамысловай кан'юнктуры паказваюць цэлы рад няспрыяючых адзнак. Як і раней, значна адстае ад плянаў зьніжэньне сабекошту. У той-жа час выкрываецца даволі рэзкая неадпаведнасьць паміж рухам выпрадуцкі на аднаго рабочага і рухам заработнае платы.

Ня менш выразна выявілася і некаторае пагоршаньне якасьці прадукцыі прамысловасьці.

Цэнтральная задачай прамысловасьці ў IV квартале зьяўляецца прывесьці ў адпаведнасьць якасныя паказальнікі з колькаснымі. Захоўваючы ня меншы тэмп росту прамысловай прадукцыі, мы павінны дабіцца карэннага пералому ў бок зьніжэньня яе сабекошту, каб забясьпечыць патрэбныя прадпасылкі для намечанага пяцігодкаю прамысловага разьвіцьця ў надыходзячым годзе.

IV квартал высоўвае перад народнай гаспадаркай СССР і перад беларускім яе вучасткам задачы вялізнага значэньня. На вырашэньне гэтых задач павінны быць накіраваны ўсе творчыя сілы нашых арганізацый. Сюды павінен быць накіраваны працоўны ўздым мас.

## ПЛЯН БРЫЯНА

### ЭУРОПА СУПРОЦЬ АМЭРЫКІ

#### Праект блёку эўрапэйскіх дзяржаў

ПАРЫЖ, 13. Адгукаючыся на праект Брыяна аб скліканьні міжнароднай канфэрэнцыі па пытаньні аб стварэньні эўрапэйскіх злучаных штатаў, орган цяжкай прамысловасьці «Бюлетэнь Котыд'ен» заяўляе: «Праект стварэньня эўрапэйскіх злучаных штатаў грунтуецца на глыбокіх падставах. Эўрапэйскія дзяржавы прымушаны процінаставіць свае аб'яднаныя сілы эканамічнаму і фінансаваму імпэрыялізму ПАЗШ, якія імкнуцца да ўсё большага паняволеньня Эўропы.

Аналізуючы газэтную шуміху вакол гэтага пытаньня «Юманіта» выкрывае глыбока-імпэрыялістычны характар брыянаўскіх плянаў, якія маюць на ўвазе па яе думцы наступнае: папершае, арганізацыю агульна-эўрапэйскага супрацьўленьня амэрыканскай мытнай палітыцы, падругое—умацаваньне гегемоніі Францыі ў Эўропе шляхам аб'яднаньня эўрапэйскіх краін вакол ядра, якое складаецца з Францыі і яе саюзьнікаў у Цэнтральнай і Усходняй Эўропе і, патрэцяе—нанясеньня ўдару СССР, супроць якога на кангрэсе міжнароднай гандлёвай палаты, які адбываецца ў Амстэрдаме, падрыхтоўваецца адзіны эканамічны фронт усіх капіталістычных дзяржаў Эўропы.

Плянам імэрыялістычнай пан-Эўропы пралетарыят павінен проціпаставіць сваю рэвалюцыйную работу для арганізацыі сусьветнай фэдэрацыі Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

### АРЫШТ КАМУНІСТЫЧНАГА РЭДАКТАРА

ПРАГА, 13. Рэдактар цэнтральнага органу чэха-славацкай кампартыі Гутман быў учора на сваёй кватэры арыштаваны і пераведзены ў турму для адбыцьця пакаранньня на адзнёй з судовых яго спраў.

## Правал антысавецкай „затеи" польскага фашызму

«Правда» у падперадавіцы пад загалоўкам «Сорвавшаяся затея польского фашизма» піша, што не дэманстрацыя на карысьць ураду Пілсудскага ціка віць зараз больш за ўсё польскі фашызм і не дзеля аднэй гэтай дэманстрацыі склікаецца варшаўскі зьезд. **Мы маем справу з палітыкай больш далёкага прыцэлу, з агрэсыўнай, захопніцкай палітыкай польскай буржуазіі.** Яе апэтыты маюць два напрамкі. **Адзін, асноўны, ідзе ў бок Савецкай Украіны і Беларусі,** другі—у бок суседніх нямецкіх краін, у якіх ёсьць досыць значная колькасьць польскага насельніцтва (Усходняя Прусія і Нямецкая Сілезія), дзе плебісцыт паводле Вэрсальскага міру даў няспрыяючыя для Польшчы вынікі.

**Адна з асноўных задач зьезду заключалася ў тым, каб даць штуршок антысавецкай агітацыі сярод польскага насельніцтва УССР, БССР, яго палітычнай падрыхтоўцы да ролі непасрэднай агентуры фашызму на выпадак вайны.** Адначасова польскі фашызм бязумоўна меў намер умацаваць свае сувязі і сярод польскага насельніцтва Нямеччыны, бо пытаньне аб нямецка-польскіх граніцах яшчэ ня вырашана капчаткова і можа паўстаць у больш вострай форме, як толькі Нямеччына дабіцца ачышчэньня Рэйнскіх правінцый.

Другая важная задача, пастаўленая арганізатарамі зьезду, датычыла польскага насельніцтва Амэрыкі. Гэтае насельніцтва налічваецца мільёнамі. Яго буржуазная верхавіна ў свой час значна дапамагала грашыма і ваеннай амуніцыяй справе аднаўленьня буржуазнай Польшчы. Забесьпячэньне падтрыманьня з боку гэтага насельніцтва ваеннай палітыкі фашызму і цяпер мае вялікае значэньне для фашызму.

Аднак, трэба прызнаць, што асноўны плян пегатнарэньня зьезду ў антысавецкую дэманстрацыю праваліўся.

Польскія працоўныя масы СССР сарвалі антысавецкую «затею» польскага фашызму. Замест выкрыцьця савецкай улады атрымалася выкрыцьцё самаго фашызму і яго антысавецкіх плянаў. Польскія працоўныя масы СССР, якія паведаліся аб варшаўскім зьезьдзе, на які яны два гады таму назад атрымалі запрашэньне, **па сваёй уласнай ініцыятыве арганізавалі выбары на зьезд і правялі гэтыя выбары пад лёзунгамі поўнага падтрыманьня палітыкі савецкай улады.** Яны дэманстравалі вялікія дасягненьні будаўніцтва сацыялізму ў савецкай краіне. Яны дэманстравалі свае ўласныя дасягненьні ў справе **разьвіцьця польскай сацыялістычнай культуры** і яны дэманстравалі сваю непахісную гатоўнасьць абараняць Савецкі Саюз супроць усіх замахаў імпэрыялістых і польскай буржуазіі ў першую галаву. Яны далі сваім дэлегатам на варшаўскі зьезд наказ давесьці даведама зьезду аб сваіх настроях і выкрыць антысавецкую, захопніцкую, імпэрыялістычную палітыку польскага фашызму перад працоўнымі масамі Польшчы.

Што маглі адказаць на гэта арганізатары варшаўскага зьезду? Дапусьціць дэлегатаў польскага насельніцтва на зьезд, даць магчымасьць ім сказаць праўду аб становішчы ў СССР і выкрыць паклёпы, даць магчымасьць ім гучна пратэставаць супроць вайны, якая падрыхтоўваецца, выкрыць да канца ілжывыя лёзунгі нацыянальнага адзінства, даць ім магчымасьць гучна заявіць аб сваёй салідарнасьці з барацьбой рабочае клясы Польшчы, сялянства і прыгнечаных народаў супроць польскага фашызму? Гэта значыла-б асудзіць на поўны і скандальны правал усю «затею». І вось польскі фашызм парашыў не дапусьціць дэлегацыю ад працоўных палякаў СССР на варшаўскі зьезд.

# АЖЫЦЬЦЯВІМ ПЯЦІГОДКУ ВЯЛІКІХ РАБОТ

## РАБОЧЫЯ ПАДПІСВАЮЦЦА НА 3-Ю ПАЗЫКУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ—ДОУГА-ТЭРМІНОВЫ КРЭДЫТ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ ДЗЯРЖАВЕ

## Захоўвайце свае аблігацыі

Справа дзяржаўнага крэдыту пачала за апошнія гады надзвычайна разьвівацца. Яшчэ тры гады таму назад дзяржаўны доўг СССР складаў (на 1-га кастрычніка 1926 г.) 657 млн. рублёў, зараз ён пераваліў ужо за 2 мільярды рублёў, а колькасьць трымальнікаў аблігацый дзяржпазык складае па усёй краіне больш 17 мільён. чалавек.

Аднак, падпісваючыся на пазыку і ўкладваючы ў дзяржаўныя аблігацыі свае дробныя зьберажэньні, рабочая кляса і працоўнае сялянства робяць толькі палову справы. Для таго, каб матар'яльная дапамога, якую яны аказваюць савецкай дзяржаве ў яе будаўніцтве, была поўнай, трэба яшчэ ўстрымацца бяз крайняй патрэбы ад закладу або продажу аблігацый.

Бо наша гаспадарка зьяўляецца перш за ўсё плянавай гаспадаркай. Мы пабудавалі вельмі напружаны пяцігадовы плян нашае народнае гаспадаркі—плян вялікіх работ. Мы перажываем першы год пяцігодкі. Наша капітальнае будаўніцтва ў прамысловасьці запраектавана на гэты год у вялізнай суме—1.659 млн. рублёў. Прыкладна, палову гэтае сумы —800 млн. руб.—павінны даць дзяржаўныя пазыкі. Пры гэтым нашы фінансавыя органы ўлічылі, што мы разьмесьцім пазык на 900 млн. рублёў, а 100 млн. руб. пойдуць на так званыя фондавыя апэрацыі Дзяржбанку, г. зн. на выдачу назычак пад заклад аблігацый і на куплю іх, калі яны будуць прад'яўлены да продажу.

Аднак, ужо 8 месяцаў бягучага году (кастрычнік-чэрвень) прымушаюць баяцца, што апошняя лічба будзе перавышана. Гэту небясьпеку трэба як-бы там ні было ліквідаваць.

Аблігацыі нашых дзяржпазык свабодна купляюцца і прадаюцца і будуць свабодна купляцца і прадавацца ў далейшым. Чуткі аб тым, што куплю аблігацый нібы дзяржава спыніць, зьяўляюцца злоснай выдумкаю і паклёпам. Трэба толькі ўсьвядоміць, што для ажыцьцяўленьня вялікіх мэт сацыялістычнага будаўніцтва савецкай дзяржаве патрэбны пазыкі не на кароткі тэрмін, а на больш доўгі, на такі тэрмін, які будзе выстарчальным для пуску ў ход прадпрыемстваў, набудаваных на пазычаныя ў насельніцтва грошы.

Толькі пры гэтай умове пазыкі прывядуць да ўзмацненьня магутнасьці дзяржавы і тым самым да карэннага палепшаньня матар'яльнага і культурнага ўзроўню працоўных.

С.

## Здаем на калектыўнае хаваньне

— Рабочыя ГОМЕЛЬСКАГА БРОВАРУ пастанавілі здаць на калектыўнае хаваньне ў ашчадныя касы ўсе аблігацыі 2-ой пазыкі індустрыялізацыі.

Сваю пастанову рабочыя выканалі, — усе аблігацыі зданы на хаваньне.

— Агульны сход рабочых СУРАСКАЙ ЛЕСАПІЛЬНІ пастанавіў здаць аблігацыі 2-ой пазыкі на калектыўнае хаваньне.

— Камісія садзейнічаньні дзяржкрэдыту МЭТАЛЮРГІЧНАГА ЗАВОДУ «КАМІНТЭРН» аформіла калектыўную здачу 70 проц. аблігацый. Камісія ўзяла на сябе абавязак давесьці лік здаўшых да 80 проц. агульнага ліку трымальнікаў пазыкі і выклікала завод «Чырвоны Мэталіст» і фабрыку—аку лняраў.

## Пачалася папярэдняя падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыю

*— Падпісваемся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 1450 р. і патрабуем ад ураду хутчэйшага выпуску 3-й пазыкі*

*— Узмацнім фінансавую базу для пасьпяховага ажыцьцяўленьня 5-цігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва.*

*— Выклікаем рабочых 1-й друкарні і друкаркі Акадэміі Навук пасьледваць нашаму прыкладу.*

*Ініцыятыўная група рабочых і служачых друкаркі і рэдакцыі газ. «Зьвязда».*

*Подпісы 10 чалавек.*

***

*— Вітаем прапанову рабочых аб выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі*

*— Абяцаем прыняць усе меры да рэалізацыі пазыкі і папярэдня падпісваемся кожны на месячную пэнсію.*

*— Заклікаем усіх асьветнікаў падтрымаць наш пачын*

*Просім ураД у магчыма кароткі тэрмін вырашыць пытаньне аб выпуску 3-й пазыкі*

*Група працаўнікоў Нар. Бам. Асьветы.*

*Подпісы 22 чал.*

***

*Рабочыя фабрыкі «Меншвэй» падпісаліся на 3-ю пазыку на суму звыш 2000 руб.*

***

*Рабочы-токар гарбарні «Бальшавік» т. Усьціновіч праз насьценгазэту зьвярнуўся да ўсіх рабочых гарбарні з прапановай прыняць выклік ленінградзкіх рабочых аб выпуску 3-й пазыкі. Тав. Усьціновіч падпісаўся на 200 руб. і выклікаў рад іншых рабочых.*

## Выпусьціць 3-ю пазыку

### Мы павінны разьлічваць толькі на свае сродкі

Індустрыялізацыя нашай краіны патрабуе вялізных сродкаў. Гэтых сродкаў нам неадкуль узяць, акрамя мабілізацыі сваіх уласных фінансавых рэсурсаў шляхам пазык. Выпушчаныя ўрадам 2 пазыкі індустрыялізацыі знайшлі гарачы водгук з боку рабочай клясы СССР. Зараз настаў момант, калі нашаму савецкаму ўраду трэба выпусьціць 3-ю пазыку індустрыялізацыі. Нама ніякіх сумненьняў, што пралетарыят СССР і на гэты раз горача спаткае мерапрыемства ўраду па індустрыялізацыі краіны. Кожны рабочы добра разумее, што грошы, якія ён пазычыць дзяржаве, ідуць на сацыялістычнае будаўніцтва, на палепшаньне быту працоўных.

Рабочы Менскай фабрыкі абутку Пасьпяшылаў (вытворчы стаж 22 гады).

### Павялічыць лік выйгрышаў

Я лічу, што зараз урад павінен выпусьціць 3-ю пазыку Індустрыялізацыі. Рабочая кляса нашай краіны, бязумоўна, падтрымае ўрад.

На гэты раз трэба паменшыць сумы выйгрышаў па пазыцы, павялічыць лік выйгрышаў. Рабочыя капіталаў на зьбіраюць і шматтысячныя выйгрышы ім не патрэбны.

Рабочы-загатоўшчык Зупэрман. (вытворчы стаж 13 гадоў).

## Дзе нічога ня робіцца ў адносінах пазыкі

### Пастановы агульных сходаў аб калектыўнай здачы ня выконваюцца

**ГОМЕЛЬ.** (Наш кар.). Прынятыя радам калектываў рабочых і служачых пастановы аб здачы аблігацый у крэдытныя ўстановы на захаваньне абярнуліся ў міккіх падушкі для некаторых фабзаўмысцкомаў, рабачкомаў, камісій дапамогі дзяржкрэдыту і адміністратараў.

Многія з апошніх сьпяць непрабудным сном.

**Групком прыватных прадпрыемстваў** саюзу камунальных рабочых не правёў сходу па пытаньні аб утрыманьні і здачы на захаваньне аблігацый 2-й пазыкі індустрыялізацыі, не спаганяе чарговых узносаў па падпісцы на гэтую пазыку і, адным словам, нічога ў гэтых адносінах ня робіць.

На **фабрыцы Дзяржшчаціна** адбываецца масавы продаж аблігацый. Заявак аб здачы на захаваньне аблігацый паступіла ўсяго 40. Члены партыі і камсамолу не паказваюць прыкладу іншым рабочым. Многія з іх ужо даўно папрадавалі свае аблігацыі. Мясцовыя арганізацыя па пытаньнях дзяржпазык нічога ня робіць.

На **заводзе Мэтпрому № 3**, дзе працуе звыш 100 рабочых, сабрана ўсяго 40 заяў аб здачы аблігацый на захаваньне і то ў адным толькі цэху. Мясцовыя арганізацыі і адміністрацыя нічога ня робіць. Заводзкая газэта ўстрымліваецца ад зьмяшчэньня артыкулаў на дзяржкрэдыце. 30-40 проц. рабочых ужо пасьпелі выкупіць і прадаць свае аблігацыі.

На **абутковай фабрыцы** як мясцовыя арганізацыі, так і адміністрацыя, і каса ашчаднасьці нічога ня робіць, матывуючы гэта тым, што з 1-га ліпеня рабочыя фабрыкі ідуць у адпачынак. Наогул з нецярплівасьцю чакаюць водпуску, а аблігацыі хутка, бяз растлумачальнае работы, выпараюцца.

На **сьпіртавым заводзе** па замацаваньні пазыкі сёе-тое робіць толькі дырэктар, а фабком і камісія дапамогі ўпэўнены, што гэта работа іх не датычыць і нічога ня робіць.

Больш за ўсіх славіцца **рабачком будаўнікоў № 2**, які заяўляе, што ён наогул нічога не павінен рабіць. Рабачком заяўляе прадстаўніком крэдытных устаноў, што «калі будзеце хадзіць, дык мы вам ня дамо ніякіх вестак і адказваць больш ня будзем».

## Не забывайце свайго абвязку перада краінай

Рашучы тэмп індустрыялізацыі краіны патрабуе ўсё новых і новых сродкаў. Вось чаму вялікае значэньне набывае калектыўнае хаваньне аблігацый у касах ашчаднасьці, каб даць дзяржаве доўгатэрміновы крэдыт.

Некаторыя працаўнікі гэтага не зразумелі. Працаўнікі Наркамзему: Будзько А., Будзько З., Гершановіч, Квіцінскі, Бахцееў, Умнякоў, Жданові, Стахееў, Рашэтнікаў і Ялісееў па агульным сходзе галасавалі за калектыўнае хаваньне аблігацый, а пасьля прадалі свае аблігацыі. Зразумела, мы ня можам забараніць трымальнікам аблігацый прадаваць іх, але мы павінны ім адзначыць, што іх учынак зьяўляецца парушэньнем абавязку перад краінай, свайго роду дэзэртырствам на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

СУПРАЦОЎНІК.

## Тыдзень праверкі хаваньня аблігацый

**ВОРША.** (Наш кар.). Акруговае бюро прафсаюзаў Аршаншчыны арганізуе тыдзень праверкі трыманьня аблігацый рабочымі і служачымі.

Саюзам прапанавана правесьці шырокую растлумачальную кампанію аб мэтазгоднасьці калектыўнага хаваньня аблігацый у касах ашчаднасьці. Гэта пытаньне будзе пастаўлена на агульных сходах. Тыдзень праверкі скончыцца 15-га ліпеня.

Зараз ужо некаторыя калектывы служачых і рабочых здалі свае аблігацыі на хаваньне ў касы.

# Па БССР

## Арганізуюцца раённыя камбінаты

**БАБРУЙСК** (наш кар.) Бабруйскі Акрвыканком парашыў арганізаваць 3 камбінаты—у Жлобіне, Парычах і Асіповічах. Камбінаты аб'ядноюць дзяржаўныя прадпрыемствы раённага значэньня.

## Двухтыднёвік фізычнага выхаваньня ў Барысаве

**БАРЫСАЎ.** (Наш кар.). З 20 ліпеня па 5 жніўня будзе праводзіцца ў Барысаве двухтыднёвік фізычнага выхаваньня. Культкамісіі барысаўскіх фабрык і заводаў наладжваюць конкурс на лепшага фізкультурніка, які ўдзельнічаў у сацыялістычным спаборніцтве і падняцьці прадукцыйнасьці працы. У часе двухтыднёвіка будуць наладжаны выхады фізкультурнікаў у вёску для падрыхтоўкі сялянскіх фізкультурнікаў, да спартакіяды.

## Адчыненьне антырэлігійнага музэю ў Магілеве

**МАГІЛЕЎ.** (Наш кар.). Гарадзкі савет адпусьціў акруговаму саюзу бязбожнікаў 1.200 руб. на адчыненьне антырэлігійнага музэю ў Магілеве. Частка антырэлігійных экспанатаў для музэю будзе закуплена ў Ленінградзе, а рэшта сабрана на месцы.

## Дапамога чачэрскім пагарэльцам

**ГОМЕЛЬ.** (Наш кар.). У зьвязку з пажарам у Чачэрску на некаторых раёнах акругі створаны камісіі дапамогі пагарэльцам. Акрвыканком прапанаваў саматужна-прамысловаму саюзу арганізаваць саматужна-прамысловыя арцелі для пагарэльцаў. Земаддзел адпусьціў дзерава пагарэльцам на забудову.

## Курсы для пясных працаўнікоў

**БУДА-КАШАЛЁВА.** (Наш кар.). У Буда-Кашалёве адкрыліся раённыя курсы для падрыхтоўкі пясных працаўнікоў. На курсах вучыцца 25 рабочых савецкіх гаспадарак.

# Яшчэ адна цагліна ў справе індустрыялізацыі

## На адкрыцьці новай швэйнай фабрыкі „Кастрычнік"

## Тав. Сталін—ганаровы швэйнік

Два гады таму назад на рагу Нова-Маскоўскай вул. і Вяземскага завулку стаялі двухпавярховыя каменныя сьцены спаленага яшчэ белапалякамі будынку-пякарні. Гады паўтара назад на гэтым месцы залажылі першыя цаглінкі вялікай фабрыкі—«Меншвэй».

А сёньня, на гэтых руінах стаіць упрыгожаная зеляніпай, лёзунгамі вялізная па сваім памеры двухпавярховая фабрыка—«Меншвэй».

14 ліпеня швэйнікі Менску ўрачыста адсьвяткавалі дзень адкрыцьця фабрыкі. Пад гукі Інтэрнацыяналу і фабрычнага гудка рабочыя швэйнікі на будынку фабрыкі ўстанавілі чырвоны сьцяг. З якім замілаваньнем, з якім захапленьнем і энтузіязмам рабочыя сустрэлі адкрыцьце фабрыкі!

На адкрыцьце новай фабрыкі сабраліся ўсе рабочыя фабрыкі, госьці з падпэфнай вёскі і падшэфныя чырвонаармейцы, дэлегаты ад «Вітшвэю», «Гомшвэю» і бабруйскіх швэйнікаў.

Мітынг адкрыў старшыня фабкому «Меншвэю». Потым слова атрымаў дырэктар фабрыкі т. **Пэйгін.**

— Восем год таму назад,—кажа тав. **Пэйгін**,—арганізаваўся «Меншвэй». Працавала 8 чалавек. На працягу трох год лік рабочых вырас да 300 чалавек. Фабрыка была ў той час у цяжкіх матар'яльных умовах. Яе хацелі закрыць. Але воля рабочых, дапамога партыйных арганізацый перамаглі, і фабрыка працы ня спыніла. Калі першыя гады фабрыка давала дэфіцыт, то цяпер яна дае значны прыбытак. Сёлета фабрыка павінна даць дзяржаве адзін мільён рублёў прыбытку. А разам з гэтым дамо работу беспрацоўным—чалавек 800.

Ад ЦК партыі і ад Менакругкому вітаў швэйнікаў **тав. Славінскі.**

— Адкрыцьцё новай мэханізаванай фабрыкі—гэта вялікае здарэньне,—кажа тав. Славінскі.—На руінах, якія пакінуты белапалякамі, мы будуем вялікія фабрыкі, падымаем прамысловасьць. Новая фабрыка, дзе будзе працаваць 1.200 рабочых,—гігант у нашых умовах.

Тав. **Славінскі** заклікаў рабочых выканаць плян пяцігодкі, актыўна будаваць сацыялізм і г. д. Ад ВСНГБ вітаў швэйнікаў тав. **Стракоўскі**, ад ЦСПСБ—г. Розін, гарсавету—т. Рабіновіч, ад ЦП саюзу швэйнікаў—тав. Сулькіна, розныя дэлегацыі і г. д.

Рабочыя швэйнікі абралі ганаровым швэйнікам сакратара ЎсеКП(б) т. **Сталіна** і пастанавілі паслаць яму разьліковую кніжку швэйніка. Таксама пасланы тэлеграмы на імя УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

***

Мітынг скончыўся. Рабочыя вялікага і малога цэхаў занялі сваё месца, каб прадэманстраваць перад гасьцямі сваю працу, паказаць мэханізаванасьць і разьмеркаванасьць працы.

Доўгай стужкай пацягнуліся людзі праз закройнае аддзяленьне. Тут працуе зусім мала людзей. Але праца мэханізавана. За час, калі рукамі закройшчык рабіў адну пару, то электрычнай машынай закройшчык робіць 25-30 пар з суконнага матар'ялу, а танейшага значна больш. Параўнаўча са старой фабрыкай ёсьць у закройным аддзяленьні і іншыя дасягненьні. Так, увесь закрой сканцэнтраваны ў адным месцы, у той час, як на старой фабрыцы быў раскіданы па паасобных пакоях. Матар'ял падаецца пад'ёмнай машынай, а раней насілі на плячох. Сталы ў закройным аддзяленьні адліты, што таксама паскарае працу.

Далей група людзей прайшла ў першы агрыгад (цэх), дзе працуе 150 чал. і малы агрыгад, дзе працуе—90 чал. Агрыгады працуюць у дзьдве зьмены (цалкам фабрыка яшчэ не пераехала).

Работа ў агрыгадах мэханізавана. Калі ў першым квартале 1928 году паліто шылася 570 мінут, то зараз паліто шыецца 292 мінуты. Вялікі агрыгад, дзе працуе 150 чал., у 292 мінуты выпускае 150 польтаў. Новая фабрыка шые толькі дамскія польты.

Ва ўмовах старой фабрыкі, каб сшыць паліто, праводзілася 54 апэрацыі. Зараз-жа гэта самае паліто праходзіць да 150 апэрацый. На гэтым фабрыка ня спыняецца, а ідзе далейшае расправоўка і вывучэньне працэсу расчляненьня далейшых апэрацый. Чым больш будзе апэрацый, тым хутчэй выходзіць паліто. Аду кішэню ў паліто робіць адзінаццаць чалавек, а 12 чалавек прышывае ярлычок. Раней кішэню рабілі ўсяго два чалавекі, а два гады таму назад адно паліто шыў толькі адзін чалавек.

Электрычныя прасы амаль ёсьць пры кожным рабочым. Раней за прасамі прыходзілася бегаць, вымяраць іх тэмпэратуру, а зараз гэтае бяганкі ўжо няма. Прас нагараецца электрычнасьцю пэўнай тэмпэратуры. Машыны таксама працуюць электрычнасьцю, што паскарае працу і менш стамляе рабочага.

Наогул ручная праца аджывае свой час. Замест рук працуюць машыны. Спэцыяльна, нават, пастаўлены чалавек для ўцягненьня нітак у іголкі.

Між іншым трэба падкрэсьліць, што ўсе нячыстоты з прыбіраньных пакояў паляцца ў спэцыяльнай печы і толькі застаецца попел без ніякага паху, які ідзе на ўгнаеньне поля.

Мэханізацыя фабрыкі дасьць значнае зьніжэньне сабекошту прадукцыі, ушчыльненне рабочы дзень, зьніжае сярэднія разрады.

На фарбыцы будзе працаваць 988 чал. швэйнікаў, 50 закройшчыкаў, рэзэрв з 83 чалавек, 116 ня швэйнікаў і 120 чалавек тэхнічнага, кантрольнага і адміністрацыйнага пэрсаналу.

Ул. Б—к.

Ангельскі цэх фабрыкі «Кастрычнік» у якім працуе 350 рабочых

# Пад уплывам кулацкай ідэалёгіі

## У чым клясавы сэнс падзей на гуце „Працы"

Як магло здарыцца, што падзеі на гуце «Кастрычнік» у яшчэ больш агідных формах і ў значна большым маштабе маглі паўтарыцца на гуце «Праца»? Як гэта магло здарыцца пасьля тэй хвалі абурэньня, якую выклікалі гэтыя падзеі ў самых шырокіх масах працоўных? Дзе вынікі ўсёй груды рэзалюцый і дырэктыў па пытаньні аб інтэрнацыянальным выхаваньні, выкліканых справаю Баршай і аналёгічнай справай у «Ноўках»?

Вось пытаньні, на якія патрабуе адказу савецкая грамадзкасьць, абураная выступленьнямі антысавецкіх элемэнтаў на гуце «Працы».

Матар'ялы, што ёсьць у нашым распараджэньні, наказваюць перш за ўсё на тое тупое неразуменьне (або нежаданьне разумець) усёй палітычнай і сацыяльнай абстаноўкі на заводзе, якую праявілі заводзкія партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі.

Завод «Працы» знаходзіцца ў адным з найбольш глухіх куткоў Беларусі, у 17 вярстох ад чыгункі. Ён акружаны ланцугом вазёр, пяскамі, лясамі і непраходнымі балотамі. 550 рабочых і іх сем'яў, ня лічачы 250-300 сэзонных рабочых на торфараспрацоўках, складаюць насельніцтва заводзкага пасёлку.

Здавалася-б, завод павінен быў быць цэнтрам пралетарскага культурнага ўпливу на вакольнае сельскае насельніцтва. Здавалася-б, што завод павінен служыць апораю для працоўнага сялянства ў барацьбе супроць кулакоў і папоўскага ўпливу, у барацьбе за сацыялістычную перабудову вёскі.

А сапраўды, тут мела месца зусім адваротнае: цёмныя антысавецкія сілы вёскі ўплывалі на завод; антыпралетарскія і кулацкія элемэнты, што пралезьлі на завод, адгэтуль праводзілі сваю лінію ў вёсцы. На заводзе арудавалі «свае» заводзкія кулакі і царкоўнікі, а таксама кулацка-папоўскія элемэнты бліжэйшых вёсак.

Былыя людзі, людзі з цёмным крымінальным мінулым, вясковыя кулакі, якія падзараблялоць на заводзе, царкоўны стараста і члены царкоўнага савету—вось фізыяномія групы, якая выдзяляла кадр для пагромных выступленьняў сярод сялянства.

Група вясковых кулакоў — спэкулянтаў, рэгулярна наведвае партыйныя і агульна-гарадзкія сходы, поп—амаль штодня наведвае заводзкі пасёлак (яму, аказваецца, выгадна хадзіць туды за 7 вёрст ад сваёй «рэзыдэнцыі»), царкоўнікі з рабочых заводзкім шклом устаўляюць дзесяткі царкоўных шыб, частка рабочых настолькі зьвязана з сельскай гаспадаркай, што глядзіць на сваю работу на заводзе, як на пабочны даход; рабочыя-эксплёататары наймаюць батракоў для падвозкі на завод матар'ялаў на сваіх конях—такія формы «мірнага ўрастаньня кулака ў сацыялізм» на гуце «Працы».

Антысэміцкія выступленьні аказаліся толькі адным са зьявеньняў даволі рознастайнай дзейнасьці кулацка-папоўскае групы. Гэтыя выступленьні мелі месца да таго, як адгрымела справа Баршай, яны ня спыняліся да таго часу, пакуль крыкі пабітага яўрэя-рабочага Гольмана не дайшлі да бюро Полацкага акруговага камітэту партыі.

Тая акалічнасьць, што ЦП саюзу хэмікаў і акруговыя партыйныя і прафэсіянальныя арганізацыі ня ведалі аб становішчы на заводзе, зразумела, гаворыць пл ў іх карысьць. Гэта толькі лішні раз паказвае, як дрэнна ўплываюць халастыя зарады «добрых» дырэктыў і нікчэмная папяровага кіраўніцтва. Толькі цяпер выкрыўся малюнак таго, як наўмысьля, як хітра замазваліся, затушоўваліся і хаваліся заводзкімі «правадырамі» падобныя факты і выступленьні. Гэта рабілася так умела, што аб паасобных выступленьнях маса рабочых заводу толькі зараз даведалася ўпяршыню.

Ці можна абвінаваціць у антысэмітызьме або хоць-бы ў прымірэнцтве ўсю масу рабочых заводу? На заводзе была цесна згуртаваная група ў 8-10 чалавек, якая рабіла сваю брудную кулацка-папоўскую справу, ёй удалося ашукаць дзесятак несьвядомых рабочых. Але маса рабочых катэгарычна (і зусім заслужала) адвяла ад сябе гэта абвінавачаньне.

Маса рабочых, у процілегласьць заводзкім «правадыром», адразу зразумела клясавы сэнс падзей на заводзе.

Бюро калектыву і заўком знаходзілі «карані» кожнага антысэміцкага, або антысавецкага выступленьня ў «несьвядомасьці» рабочых, «не надавалі значэньня» гэтым выступленьням, прапушчалі заявы рабочых і патрабаваньні пакараньня антысэмітаў міма вушэй.

Маса рабочых абвясьціла вайну антысэмітам - контррэвалюцыянэрам. Іменна рабочыя заводу выкрылі прымірэнчую пазіцыю «трохкутніка». Маса рабочых паказала, што і заўком і бюро калектыву апынуліся ў хвасьце невялікай кулацка-папоўскай групы.

А. ФУРЭМС.

## Да падзей на гуце „Працы"

### ДАТЭРМІНОВАЯ ЧЫСТКА ПАРТКАЛЕКТЫВУ ЗАВОДУ

### Сакратар партканлектыву зьняты з працы

**Полацк** (наш кар.). Бюро Полацкага акругкому КП(б)Б заслухала даклад камісіі, якая выяджала на гуту «Працы» для расьсьледваньня апошніх падзей на заводзе.

Бюро пастанавіла ў самы бліжэйшы час правесьці датэрміновую чыстку партыйнага і камсамольскага калектыву на гуце.

Бюро пастанавіла зьняць з пасады сакратара калектыву т. Гурскага, які не рэагаваў на антысэміцкія выступленьні на гуце. Пракурору даручана тэрмінова скончыць сьледзтва па справе антысэмітаў гуты і назначыць паказальны працэс.

Аддаюцца пад суд майстры Кострыц, Мардвінаў М., Ляўковіч А., Крыцкі, Камінскі А., Авечкіны В. і І., Пачкай, Самусёў і інш. З іх 7 чалавек знаходзяцца пад вартай.

# Сацыялістычнае спаборніцтва

# Дасягненьнямі пахваліцца ня можам

## У САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА НА НЕКАТОРЫХ ЗАВОДАХ ЯШЧЭ НЯ УЦЯГНУТЫ ШЫРКІЯ МАСЫ ПРАЦОЎНЫХ

## Па каляінах домбалеўскага спаборніцтва

### Бяз руля і без вятрыл

У пачатку мая завод імя «Домбаля» прыняў выклік гуты «Каміптэрн» і ўступіў у сацыялістычнае спаборніцтва. Закінела падрыхтоўчая работа, пачалі склікацца сходы, насяджэньні, пачаліся гутаркі.

Рабочая маса, зразумеўшы задачы спаборніцтва, заварушылася. Адзін за адным пасыпаліся выклікі на спаборніцтва паміж паасобнымі варштатамі, калектывамі і зьменамі. Гэта гаварыла за тое, што падрыхтоўчая работа была праведзена добра.

Але мацней прыгрэла сонейка, павеяла водпускамі, адчулася стомленасьць ад дзесяткаў сходаў і пасяджэньняў і... пра кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам на заводзе забыліся.

Праўда, заўком агаварыўся, што кіраўніцтва ўскладаецца на вытворчыя камісіі, а сам узяў «вярхоўную» ролю агульнага нагляду...

Калі дадаць, што агульназаводзкая і цэхавыя вытворчыя камісіі зусім ня кіруюць спаборніцтвам, дык можна прадставіць сабе агульны малюнак спаборніцтва, аб якім мы будзем гаварыць далей.

### „Дабра ня чуваць"

Зьмена дзесятніка Грушэўскага спаборнічае са зьменаю дзесятніка Лукашэвіча, а зьмена дзесятніка Лікевіча—са зьменаю дзесятніка Эпштэйна. Спачатку спаборніцтва паміж зьменамі прайшло паўтара месяца і, нятлеючы на гэта, ніхто ня можа сказаць, якая зьмена і ў якой галіне мае дасягненьні і якія недахопы ёсьць у тэй ці іншай зьмене. Пазьменны вучот адсутнічае, і зьмены спаборнічаюць у поўным сэнсе гэтага слова з заплюшчанымі вачыма. Ня толькі няма лічбаў, падагульваючых ў паасобку работу кожнай зьмены, няма таксама і лічбаў, падагульваючых вынікі работы ўсяго заводу з моманту ўступленьня ў спаборніцтва. Заводакіраўніцтва абмяжоўваецца складаньнем дзесяціднёвак, падагульваючы паасобку работу кожнага майстра, але гэтыя дзесяціднёўкі мала аб чым гаворыць.

Нядаўна адзін з экскурсантаў на заводзе запытаўся:

— Што чуваць у вас з дасягненьнямі па спаборніцтву.

— Дабра ня чуваць,—адказалі яму рабочыя, якія ня ведаюць, ці ёсьць у іх дасягненьні, ці зьнізіўся брак, прагулы, сабекошт, ці наадварот, павысіліся.

### Пануе безгаспадарчасьць

Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал заводу таксама ўступіў у спаборніцтва, узяўшы на сябе рад абавязацельстваў. Але адна справа паабяцаць, а другая —выконваць.

Апошні час сапсавалася цкло ў ванвай печы, што павялічыла брак. Ня глядзячы на рад пастаноў вытворчых нарад, да гэтага часу няма добрых форм. Прэсы спрацаваныя. Але ад адміністрацыі цяжка дабіцца зьнішчэньня нават такое дробязі, як рамонт паветраных труб пры прэсах, якія па некалькі раз у адну зьмену скідаюцца і прыходзяцца спыняць варштат, каб устанаўляць трубы. Дах тут над варштатам лямпавага шкла дзіравы. Калі ідзе дождж, дык тром варштатам лямпавага шкла прыходзіцца кідаць работу і чакаць пакуль перастане дождж.

Гэтыя, з пункту гледжаньня адміністрацыі, «дробязі» выклікаюць справядлівыя папрокі рабочых. А такіх «дробязяй» на заводзе шмат.

### На адным абяцаньні ня выедзеш

За першае паўгодзьдзе завод зьнізіў сабекошт усяго на 1,5 проц., працдыцыпліна кульгае на абедзьве нагі, а таму патрэбна максымальная энэргія, каб нагнаць страчанае. Гэта разумелі рабочыя, калі падпісвалі дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве, але ёсьць шмат і такіх рабочых, якія, відавочна, зусім забыліся пра ўзятыя на сябе абавязкі.

Напрыклад, рабочы Васілеўскі А. парашыў прадаць аблігацыі, для гэтага ён прыкінуўся хворым, кінуў работу і пашоў у банк. Наборшчыку Стэфановічу спадабалася быць юрысконсультам і ў часе работы ён дае парады, растлумачэньні і г. д. Майстар шліфоўні № 2 Цырлінскі Язэп у начных зьменах тры разы падрад сьпіняў на 5 хвілін да гудка усе затопачныя машыны, спыняючы такім чынам работу ўсяго цэху.

Такіх прыкладаў напляваньня адносін да работы ёсьць дзесяткі, і асабліва дрэнна, што сярод гэтых гультаёў скрозь і ўсюды пападаюцца камсамольцы і партыйцы.

### „Мая хата з краю"

— Хто хоча ведаць, што будзе ў цэху, няхай застанецца пасьля работы?

— Першы раз у цэху роўна а 5-й гадзіне...

— ???.

Гэтыя плякаты, будучы разьвешанымі па сьценах шліфоўні № 1, сваімі загадкавымі словамі інтрыгавалі рабочых.

Адразу-ж пасьля гудка, ледзь памыўшы рукі, у цэху сабралася каля 90 чалавек і зьявіліся рабкоры, якія парашылі зрабіць вылазку ў цэх, для таго, каб на месцы ў цэху высьвятліць усе прычыны, што перашкаджаюць ходу сацыялістычнага спаборніцтва.

Пасьля кароткае інфармацыі аб задачах вылазкі, рабкоры чакалі, што іх засыплюць заметкамі, што яны не пасьпеюць запісваць выступленьняў рабочых, але было ціха... Самакрытыка не магла прарвацца праз шлюз абываталь-ское прыказкі «мая хата з краю, я нічога ня ведаю».

Выратавалі разданыя зараз-жа рабкорамі спэцыяльныя лістоўкі аб вылазцы з чыстым лістком паперы для заметкі. Тое, аб чым некаторыя не хацелі гаварыць, напісалі на гэтых лістках; рабкоры, атрымаўшы каля 20 заметак, гаварылі:

— Гэта наша першая практыка, а першы блін бывае комам... У далейшых вылазках мы ўлічым дапушчаныя намі памылкі і правядзем работу інакш. Трэба гутарыць з рабочымі, а не ператвараць вылазку рабкораў у нейкі сход.

### „Калі паска, за 10 капеек"

Рад фактаў гаворыць пра тое, што іменна зараз, калі на заводзе праводзіцца сацыялістычнае спаборніцтва, і культурна-масавая работа павінна быць пастаўлена на адпаведную вышыню, па культурна-масавай рабоце нічога ня робіцца. У заводзкім парку каля пустуючых кракетных, баскетбольных і іншых пляцовак групкі рабочых азартна «рэжуць у карты», прагульваючы да ста рублёў, гадзіньнікі, капальні і г. д. Ды і ня дзіва. Гурткі, за выключэньнем фізкультурнага, разваліліся. Такія гурткі, як драматычны, сіняя блюза, фота-гурток, ня гледзячы на рад патрабаваньняў, не арганізоўваюцца. Адзіная забава, якая дасягла рабочаму—гэта кіно (два разы на тыдзень), але і тут ля ўваходу рабочага сустракаюць словамі—«калі ласка, 10 капеек за ўваход».

Ўзімку апраўданьнем дрэннай пастаноўкі культмасавай работы можа служыць адсутнасьць клюбу, але цяпер, калі ў нас ёсьць добра абсталяваны парк, няма і ня можа быць ніякіх апраўданьняў, а ня гледзячы на гэта, у парку не праводзіцца ніякае работы, апрача гульні ў карты.

### На новыя рэйкі

Магчыма, заводзкія арганізацыі прывыклі да недахопаў, штодня гледзячы на іх, але на новага чалавека гэтыя каляіны домбалеўскага спаборніцтва робяць вельмі цяжкое ўражаньне. Ясна, што ўся работа па правядзеньні і кіраўніцтву спаборніцтвам павінна быць накіравана на новы шлях. Трэба падтрымліваць энтузіязм мас, а ня глушыць яго няўмелым кіраўніцтвам. Трэба на прыкладах і лічбах паказваць рабочаму пра тыя недахопы і дасягненьні, якія ёсьць у спаборніцтве, а не таіць іх. Заўком-жа ў першую чаргу цэнтрам сваёй увагі павінен паставіць культмасавую работу, якую накіраваць на ўсебаковае адлюстраваньне сацыялістычнага спаборніцтва.

Ул. Л.

## Рабочыя ў спаборніцтва ня ўцягнуты

Дражджавы завод **«Чырвоная Зара»** (Менск) першы сярод іншых дражджавых прадпрыемстваў СССР выступіў у сацыялістычнае спаборніцтва. Трэба сказаць, што спаборніцтва дае заводу бясспрэчны эканамічны эфэкт. За гэты пэрыяд мы маем прыблізна наступныя посьпехі.

За III квартал гадавая вытворчая праграма выканана на 26,4 проц., а ўсяго за першыя тры кварталы бягучага году гадавая праграма выканана на 83 проц.

Лік прагулаў за III-ці квартал па нягрунтоўных прычынах скарочаны да 0,05 проц., тады як за 1-е паўгодзьдзе прагулы на заводу складалі 0,48 проц.

Прадукцыйнасьць працы на аднаго чалавека ў дзень за III-ці квартал складае 50,55 кгр. у той час, як за 1-е паўгодзьдзе складала 47,15 кгр., такім чынам, прадукцыйнасьць працы за паказаны квартал у параўнаньні з 1-м паўгодзьдзем павялічылася на 7,2 проц., а ў параўнаньні з мінулым годам на 36 проц.

Па сацыялістычным дагаворы наш завод абавязаўся выпрацаваць у 2-м паўгодзьдзі 1.417,5 тон дражджаў, фактычна-ж, за III квартал выпрацавана менш на 100 тон, але гэта не на віне заводу, а з прычыны адсутнасьці попыту на рынку. Прагулы на нягрунтоўных прычынах павінны былі быць зусім зжыты, усё-ж мы мелі за квартал 8 дзён прагулаў. Прадукцыйнасьць працы мы абавязаліся давесьці да 51,7 кгр. на чалавека ў дзень, а фактычна маем толькі 50,55 кгр.

Спаборніцтва на заводзе пачалося па ініцыятыве вытворчае нарады і агульнага сходу рабочых і служачых заводу. Кіраўніцтва спаборніцтвам было ўскладзена на вытворчую камісію, але, на жаль, пасьля падпісаньня дагавору, вытворчая камісія супакоілася і больш нічога не зрабіла. Культкамісія за ўвесь час не правяла ніякай растлумачальнай работы ў адзяленьнях з рабочымі аб значэньні сацыялістычнага спаборніцтва, і таму ма

# ЭСКАДРЫЛІЯ СУСЬВЕТНАЙ КАМУНЫ*)

## АПАВЯДАНЬНЕ С. БУДАНЦОВА

### Пачатак і канец сусьветнай вайны

Прычыны другое сусьветнае вайны 1934-36 г. г. даволі былі абмеркаваны і прадугаданы яшчэ ў 20-я гады. Мне застаецца толькі напомніць пра зачэпку.

Сараеўскае забойства здаецца грандыёзнай эпапэяй, калі параўнаць яго з няўдалай апэрацыяй, зробленай Люі Арсенам прынцу Філіпу Румынскаму. Паганым месцам, адкуль ішлі крывавыя супярэчнасьці таго часу, была Трансыльванія, гвалтоўна адабраная ад Вэнгрыі.

Забойства Фэрдынанда аўстрыйскага і фарсавае здарэньне з Філіпам былі роўназначнымі прычынамі і выпікамі гістарычных падзей.

Прынц Філіп, пажадаўшы амаладзіцца, накіраваўся ў Будапэшт да выдатнага біолёга і хірурга Люі Арсена, бэльгійскага эмігранта, які асымілёваўся ў Вэнгрыі. Апэрацыя не ўдалася: траскучы, хрыпаты бас імпазантнага прынца зрабіўся сіплым дыскантам, нафарбаваныя вусы і бародка Філіпа вылезьлі, ён памаладзеў на гадоў пяцьдзесят адразу, без надзеі на тое, што сасьнее і зноў праробіць той цыкль прыемнасьцяй, для якога ён лёг пад згубны лянцэт. Магчыма, што далейшая работа хірурга і вярнула-б яго пакутнаму пацыенту жаданую мужнасьць, але гэта патрабавала часу і новых пакут.

Адным словам, няўдалая апэрацыя, што перапыніла бакавую лінію пастоланасьледаваньня, была вытлумачана як варожы акт, як лютая інтрыга агрэсыўных вэнграў. Тон узаемных нот павысіўся на некалькі актаў, як голас каранаванага кастрата, і вайна пачалася.

Гэты напалову забыты эпізод, выкінуты са школьных падручнікаў, тут падаецца між іншым.

Яшчэ жывы ўспаміны і нават удзельнікі першай эўрапейскай вайны; чырвоны сьцяг СССР разьвіваўся на ўсходзе; ня шэпты Цымэрвальда, а грозны голас Камінтэрну грымеў над усім сьветам; агністая мова яго адозваў да паўстаўшых народаў, назаўсёды застанецца помнікам тых гэроічных часоў.

Савецкая Расія ў вайну ня была ўцягнута, але яе межы пільна вартаваў паветраны флёт, і толькі рэвалюцыі спачатку ў Італіі, а потым у Нямеччыне ўвосень 1936 году накіравала ваенную сілу Расіі, на дапамогу пралетарыяту.

Зразумела, паветраны флёт за некалькі месяцаў да таго, як загінулі акраінныя дзяржавы Расіі—Эстонія і Латвія—адыгрываў найважнейшую ролю ў зносінах сусьветнай рэвалюцыі, полымя якое разгарвалася і пашыралася.

Сэрыя паўстаньняў у Эўропе замкнута была Англіяй, на Далёкім Захадзе і Ўсходзе—Японіяй. Гэта было ў 1938 годзе.

Жудасная грамадзянская вайна выбухала не ў адзін час усюды. Вялася яна па ініцыятыве і сіламі банды інтэрнацыянальнай буржуазіі, якая, праўда, праз увесь час усё зьмяншалася. Шчырасьць пралетарыяту, яго запал і непрактычнасьць, з аднаго боку, цяжар і складанасьць работы, неадначаснасьць рэвалюцый—з другога, дазволілі вялізарнаму чорнаму інтэрнацыяналу скансалідаваць і ўмацавацца на востраве Мадагаскары, дзе на заходнім беразе быў заложаны горад Фохтбург, названы імем ваеннага дыктатара рэакцыянераў. Фэльдмаршал Фохт—звалі дыктатара.

Па грамадзянскіх справах яму дапамагаў, а таксама стаяў на чале габінэту ўжо стары, але ўсё яшчэ жвавы і вяртлявы Мусоліні.

Сацыяльны лад гэтае сваясаблівае дзяржавы прадстаўляўся нам алігархіяй у чыстым відзе. Тубыльцы—мадагасы і нэгры—банту былі абернуты ў нявольнікаў.

Два гады фэльдмаршал Фохт пры дапамозе свайго морскага міністра Фута-Яма займаўся пірацкімі справамі на моры. Маючы значны морскі флёт, ён пасьпеў сьцягнуць вялізарныя запасы індустрыяльнага сырцу і абсталяваньня на Мадагаскар. Былі знойдзены карысныя выкапні, якія дазволілі паставіць некаторыя віды абароны востраву засканела. Ад мора былі скрозь заложаны міны; наймацнейшыя зэнітныя гарматы былі сур'ёзнейшай перашкодай для самага дасканалага паветранага флёту.

Голас розуму чуўся ў гэтыя гады стварэньня крэпасьці контррэвалюцыі са старонак маскоўскай прэсы, але яго не пачулі: сталіцай сьвету зрабіўся Лёндан, а там слухалі толькі бадзёры грукат малаткоў пераходнага да сацыялізму пэрыяду.

### Асінае гняздо

Ці варта гаварыць аб тым, што ні аднаго расійца ня было на востраве Мадагаскары. Так званыя нэпманы не прабавалі нават, каб пераваліць строгія граніцы першай Савецкай рэспублікі. Эміграцыя Курфюрстэндаму, Канстантынопалю і Бэлграду рынулася ў Расію як толькі пачалася вайна, а ў часе італьянскага паўстаньня апошні граф Бобрынскі памёр у Ніцы ад разрыву сэрца.

Эпідэмія самазабойстваў сярод тых, для каго ня было прытулку ў рэвалюцыйных краінах, даканала мізэрныя рэшткі старых ворагаў расійскага пралетарыяту.

Мадагаскар жыў, як асінае гняздо, напоўненае вытрымананай злосьцю і зусім адрэзанае ад усяго сьвету. Радыё-сувязь з Эўропай была забаронена, будаваць радыё-станцыі дазвалялася толькі да пэўнай ведамі абмежаванай магутнасьці і калі хто перавышаў яе, той караўся па 874 артыкуле крымінальнага кодэксу, як дзяржаўны здраднік.

Фохт, Мусоліні, Артур Рокфэлер—малодшы—прадаўшы грамадзкае думкі—цягнулі праслынутую «прапаганду чаканьня», маючы надзею, што пачвара рэвалюцыі зжарэ самую сябе. Дапамагчы гэтаму яны не маглі: ні інтэрвэнцыі, ні блёкады нельга было прадбачыць у будучыне. Прыклад-жа расійскай эміграцыі не навучыў нічому.

Усё-ж сьмеху варта была-б думка, што з дзевяці тысяч сусьветных капіталістых на сыстэме сапраўды нязвычайнай эксплёатацыі тубыльцаў, даводзілі якраз адваротнае. Мацнейшыя чакалі.

Слабейшыя, у першую чаргу сантымэнтальныя дурні, пагандляваўшы піражкамі, рысам, уласным целам і лахманамі, выміралі ад трапічных хваробаў і сыфілісу. На павольнае згасаньне вогнішча рэакцыі разьлічваў і чырвоны Лёндан і... памыліўся.

Адна толькі галіна індустрыі, вайны і абароны ня мела развою на Мадагаскары: пабудова паветраных апаратаў. Фэльдмаршал Фохт сказаў на пасяджэньне савету дзевяці 14 студзеня 1941 г. наступнае:

— Я запэўняю, што трэба катэгарычна забараніць будаваць самалёты; вельмі частыя выпадкі ўцяканьня ў разбэшчаны сьвет рэвалюцыі і мяцежу прымушаюць мяне патрабаваць гэтага ад ураду. Мае ваенная ведамства, якое трымае ў парадку 12.000 вэтэранаў грамадзянскай вайны, усе тубыльныя батальёны і 50.000 рабочых ваеннага заводу далучаюцца да мяне.

Апошняя фраза прамовы Фохта прагучэла строгім загадам.

Сапраўды, як толькі афіцэр-лётнік нават падымаўся ў паветра, ён адчуваў што варыцца ў бульёне нянавісьці ўнізе ён ня можа, і ён трымаў курс на поўнач, да туманнай Афрыкі, адкуль да крамольнай і міласьлівай Эўропы так блізка...

— Рэвалюцыйная стыхія—гэта паветра,—сказаў неяк Мусаліні ў інтымным коле баронэсы Гіршман.

Гэта пераказвалася ва ўсіх сьвецкіх гасьціных.

Фэльдмаршал даў вялікую ўзнагароду інжынэру Бітэрфорду, які вынайшаў паўтаратонныя паветраныя міны з наймацнейшага, ім ужо ўдасканаленага пікрынолу. Гэтыя міны, што выбухалі на вышыні да васьмі і нават дзесяці кілёмэтраў, рабілі цэлую сыстэму паветраных амаль цыліндрычных ям і гураганных плыняй, а таксама зьявы паветранай дэтонацыі, у якіх загінула некалькі дзэвэртыраў Мадагаскару, што прабавалі ўцячы ў чырвоную Афрыку.

Лябарант прафэсара целамэханікі Канэ, Раймонд Пуассон, удасканаліў пасылку без правадоў моцных хваль электрычнай энэргіі. Гэтыя хвалі, калі яны датыкаліся да дзюралюміню, з якога будаваліся ўсе паветраныя лётныя апараты, давалі моцную іскру, вельмі нясьпечную як для самога апарату і матора, так і галоўным чынам, для выбуховых матэрый, што захоўваліся на паветраных караблёх.

Мадагаскар здаваўся няпрыступным.

Трэба сказаць, што ў спэцыяльных колах Лёндану і Кройдону (цэнтральны брытанскі аэрадром) пра ўсё гэта даведаліся ад паветраных перабежчыкаў.

І ў вольнай лябараторыі расійскага чырвонага флёту, Аляксея Уралава, ішла інтэнсыўная работа па забесьпячэньні і абяшкоджаньні самалётаў да хваль Пуассона і па ўдасканаленьні стабілізатараў, што даюць найбольшую ўстойлівасьць самалёту.

Сёй-той з членаў Савету Народных Камісараў Сусьветнай Камуны таксама пачаў думаць пра лёс Мадагаскару і яго насельнікаў. Пра гэта гаварыў Уралаў, якому, як старшыні ЭПК (Эўропейскі паветраны камітэт), часта даводзілася бываць на пасяджэньнях ураду і розных высокааўтарытэтных камісій.

Аляксей Сьцяпанавіч Уралаў быў удзельнікам грамадзянскай вайны ў Расіі. У 1926 годзе ён скончыў Акадэмію паветранага флёту імя Н. Е. Жукоўскага.

У 1929 годзе вышла яго выдатная кніга «Стратэгія і тактычныя асаблівасьці паветранага бою», якая адразу паставіла імя нашага лётніка побач з Кляўзевіцам і Бэрнгардзі. Кніга была перакладзена на ўсе мовы і стала настольнай у кожнага генштабістага і ваеннага лётніка.

У часе эўрапейскай грамадзянскай вайны таварыш Уралаў быў начальнікам аб'яднаных сіл Расіі, Нямеччыны і Італіі і практычна ўдасканаліў свае думкі..

Яшчэ ў 1939 годзе таварыш Уралаў, пратэставаў супроць бесьперашкоднай эвакуацыі сусьветнай буржуазіі на востраў Мадагаскар і прапаноўваў ліквідаваць пірацкія ўчынкі свайго старога ворага, фэльдмаршала Фохта. Але т. Уралаў быў прызначаны на адказны мірны пост старшыні ЭПК і гэта накіравала яго энэргію ў другім напрамку. Усё-ж калі пачалі прылятаць першыя перабежчыкі—авіятары з лягеру Фохта, т. Уралаў напісаў у парыскай газэце «Юманітэ».

«Мы дазволілі ўмацавацца на далёкім ускрайку чорнай зграі контр-рэвалюцыянэраў. Яны ня трацяць марна часу. Узброеныя тэхнікай, маючы такіх вынаходцаў, як Канэ, Пуассон, Бітэфорд, якія вядомы кожнаму чытачу-рабочаму, Фохт і Мусаліні абярнулі Мадагаскар у няпрыступную цытадэлю. Для посьпехаў магутнай і рознастайнай прамысловасьці там пануе шалёная эксплёатацыя чорных нявольнікаў. Сотні тысяч іх стогнуць пад ботам грубога салдафона. А чым яшчэ могуць зьдзівіць нас гэтыя гвалтаўнікі Мадагаскару, якую каверзу прыдумаюць яны для сваёй бясплённай, але ўсё-ж небясьпечнай помсты і злосьці?

«Не, гэты паўднёва-афрыканскі Картаген павінен быць зруйнаваны».

Наўкола артыкулу распачалася жвавая дыскусія, якая выявіла, на жаль, што ніхто сур'ёзнага значэньня работам мадагаскарскіх лябараторый не надаваў, і таварыш Уралаў застаўся ў меншасьці. Потым перабежчыкі не прылятэлі ўжо зусім пасьля вядомага дэкрэту Савету дзевяці, і пра Мадагаскар забыліся.

(Працяг будзе)

*) Пераклад з расійскай мовы з збору апавяданьняў С. Буданцова. Гэта апавяданьне ўвойдзе ў зборнік, які будзе надрукаваны Белдзяржвыдавецтвам на беларускай мове.

## МЕНСК

### Акруговыя вайсковыя старлковыя спаборніцтвы

#### Камаиды АБВШ ідуць наперадзе

Пачаліся стралковыя спаборніцтвы часьцей БВА і стралкоў грамадзкіх арганізацый. Цэнтральны савет Асоавіяхіму даў разьвёрстку на 26 стралкоў з усіх округ, пакуль прыбылі 2 з Магілеву.

Арыентыровачна пакуль што першае месца займае каманда **Беларускай Аб'яднанай Школы**, якая дала 331 ачко.

Другое месца—2-я каманда таксама АБВШ, якая дала 322 ачкі.

Трэцяе месца — каманда Н-га стралк. дывізіі, якая дала 311 ачкоў.

Асноўная мэта ўдзелу асоавіяхімаўскіх стралкоў БССР у акруговых спаборніцтвах—адбор лепшых стралкоў на Ўссаюзныя стралковыя спаборніцтвы Асоавіяхіму, якія адбудуцца ў жніўні г. г.

#### Ад'езд украінскіх фізкультурнікаў

Дэлегацыя украінскіх фізкультурнікаў выехала ў Бабруйскую і Гомельскую округі, дзе будуць арганізаваны таварыскія спартыўныя спаборніцтвы з мясцовымі фізкультурнікамі.

#### Спаборніцтвы „Украіна-Беларусь"

12 ліпеня на стадыёне МБВ чыгункі вяліся таварыскія спатканьні паміж беларускімі і украінскімі фізкультурнікамі.

Па лёгкай атлетыцы быў арганізаваны бег на 100 мэтраў для мужчын і на 60 мэтраў для жанчын, пераскокі ўдаўжыню і кіданьне дыску. Нягледзячы на дождж, былі паказаны добрыя дасягненьні. У бегу на 100 мэтраў першым зьявіўся **Кузьмін**—Менск (11,6 сэкунды), у другім—**Куроўскі**—Украіна (11,9). У жаночай камандзе першай зьявілася **Раманоўская**—БССР (8,4 сэкунды) і другой—**Рукаманава**—Украіна (9,1 сэк).

Па лёгкай атлетыцы ўперадзе ўвесь час ішоў калектыў менскіх фізкультурнікаў.

На той-жа плянёўцы адбыліся спатканьні па валейболе паміж камандамі Украіна—БДТ. Ігры скончыліся з выпікам 2 : 0 у карысьць Украіны.

### БелАПП—шэф 2-й тэрытарыяльнай

**Учора ў лягеры «Чырвонае Ўрочышча» адбыўся Ўрачысты сход чырвонаармейцаў і камандзіраў 2-й тэрытарыяльнай Беларускай дывізіі сумесна з прадстаўнікамі Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў.**

**БелАПП прыняў шэфства над вайсковымі карэспандэнтамі і чырвонаармейцамі дывізіі. Выступаўшыя чырвонаармейцы паказалі на тое, што пралетарскія пісьменьнікі павінны ўзяцца за адлюстраваньне ў літаратуры чырвонаармейскага жыцьця, а таксама за сыстэматычнае забесьпячэньне чырвонаармейскага чытача навінкамі беларускай літаратуры.**

### Чыстка апарату Белдзяржстраху пачынаецца 17 ліпеня

**17 ліпеня а 7-й гадзіне ўвечары, у клюбе гарбароў (рог Камсамольскай і Рэвалюцыйнай, № 7-11), адбудзецца агульны сход служачых Белдзяржстраху, на якім ставіцца даклад камісіі па агляду Белдзяржстраху ў зьвязку з чысткай апарату.**

**Запрашаюцца рабочыя шчаціншчыкі, гарбары і ўсе жадаючыя прыняць удзел.**

**КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ.**

### Крэдытаваньне рабочых і служачых

**Белрабсэкцыя разьмеркавала паміж цэрабкопамі 950.000 руб. доўгатэрміновага і кароткатэрміновага крэдыту. Доўгатэрміновы крэдыт выдаецца рабочым і служачым на тэрмін ад 3-х да 6-ці месяцаў для пакупкі гатовае вопраткі, мэблі і начыньня. Менскаму ЦРК адпушчана на крэдытаваньне 280.000 руб.**

### Вынікі конкурсу на лепшую сталоўку

**Закончыўся конкурс на лепшую сталоўку МЦРК у БССР. Конкурснай камісіяй разданы наступныя прэміі: магілёўскай сталоўцы № 1—80 руб. і гомельскай сталоўцы—150 рублёў. У Менску разданы прэміі пасобным працоўнікам.**

### Прамысловая карта БССР

**Інжынэр ДАБАГОЎ скончыў работу па складаньні прамысловай карты БССР. Экзэмпляр карты перададзены ў Бел Акадэмію Навук для канчатковай карэктуры. Карта будзе выпушчана да 1 кастрычніка ў ліку 9.000 экзэмпляраў.**

### За дзень

**Арганізацыя тэатру рабочай моладзі. —Прэзыдыум ЦП саюзу працаўнікоў мастацтва прызнаў мэтазгодным арганізаваць тэатр рабочай моладзі ў Менску.**

**Экспэдыцыя Акадэміі навук у Полаччыну. Беларуская Акадэмія Навук арганізуе экспэдыцыю ў Полацкі раён для вывучэньні покладаў вапны каля раки Сурянкі. Экспэдыцыя будзе арганізавана геалёгічным інстытутам.**

### Здарэньні

**Падлог лекавых картак. Крымвышукам ятрыманы гр. Кэнэвалаў, які падрабіў лекавую картку і замест належных яму 53 руб. хацеў атрымаць 153 р.**

**Растратчык. Касір ТПО Праюм растраціў 750 р. Растратчык прыцягваецца да крымінальнай адказнасьці.**

**Забойства. Па Татарскай вуліцы знойдзены труп гр-на Ігнатовіча, які быў зарэзаны нажом. Крымінальным вышукам выяўлена, што забойцай зьяўляецца таварыш забітага Хатчэнка. Забойца затрыманы.**

**Бойка на кірмашы. 4 ліпеня ў часе кірмашу ў мястэчку Шацку цыганы распачалі бойку з сяляна мі, 8 чалавек цяжка паранены кіямі.**

### Аплата працы батракоў

**Наркампрацы прапанаваў Райвыканкомам устанавіць мінімальныя стаўкі аплаты часовых рабочых у кулацкіх гаспадарках. Стаўкі ўстанаўляюцца за 8-мігадзінны рабочы дзень. За звыштэрміновую працу, за працу ў сьвяточныя дні аплата павінна быць ў падвойным разьмеры. За парушэньне гэтых правіл уласьніні гаспадарак будуць прыцягнуты да адказнасьці.**

### НКЗ БССР запрошаны на Ўсходня-эўрапейскі кірмаш

НКЗ БССР атрымаў запрашэньне прыняць удзел у Ўсходня-эўрапейскім кірмашы, які адбудзецца ў Кенісбэрзе 18—21 жніўня г. г.

На кірмашы абсталёўваецца таксама с.-г. выстаўка.

### Аўтамабілі для перавозкі грузаў

Аўтакіраўніцтва арганізавала калёну аўтамабілёў для перавозкі грузаў. За куплены 3 грузавыя аўтамабілі грузаўмястачка Шацку цыганы распачалі бойку з сяляна мі, 8 чалавек цяжка паранены кіямі.

### За інтэрнацыянальнае выхаваньне рабочых!

У сучасны момант праблема інтэрнацыянальнага выхаваньня рабочых становіцца вельмі важнай і практычна неабходнай. Савецкі Саюз стаіць зараз у цэнтры ўвагі ўсяго сьвету.

Нашы прыяцелі, а таксама нашы ворагі, з вялікай увагай сочаць за кожным нашым крокам. Навакол кожнага нашага посьпеху, або няўдачы ў сацыялістычным будаўніцтве краіны за мяжой вядзецца вялікая барацьба за ўплыў на масы.

Непасрэдная сувязь працоўных Савецкага Саюзу з замежнымі таварышамі зьяўляецца магутным фактарам гэтага ўплыву. Заваяваць рабочыя масы, вызваліць іх ад уплыву буржуазнай і капіталістычнай прэсы, паказаць ім усю хлусьню, якую ім падносілі іх, так званыя, «правадыры» — сацыял-фашысты, зьністожыць іх рэфармісцкія ілюзіі — лепш за ўсё шляхам непасрэднай сувязі паміж самімі працоўнымі СССР і замежаў.

Падзеі апошніх часоў з асаблівай вострасьцю высоўваюць неабходнасьць узмацненьня інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных СССР.

У рабочым руху адбыліся вялікія зрухі ўлева. Рэфармізм з кожным тыднем губляе давер'е рабочых мас. Аб гэтым сьведчаць перамогі камуністых на выбарах нямецкіх фабзаўкомаў, рад забастовак, у часе якіх рабочыя, ня гледзячы на здрадніцкую палітыку сацыялдэмакратаў, моцна трымаюцца.

У масах радавых сац.-дэмакратаў расьце нездаволенасьць контр-рэвалюцыйнай дзейнасьцю сваіх «правадыроў». Расьце і мацнее «апазыцыя» ў радах сацыял-дэмакратаў. Вось аб гэтым павінны ведаць нашы працоўныя!

Рад нашых арганізацый — МОПР, ЛСМБ, ячэйкі эспэрантыстых і інш. вядуць інтэрнацыянальную працу, пры дапамозе якое магчыма шырока паставіць інтэрнацыянальнае выхаваньне. Той-жа членскі ўнос МОПР'у, інтэрнацыянальны пятак, міжнародная перапіска — атрымалі-б зусім іншае значэньне, каб разам з гэтым было зьвернута больш увагі на інтэрнацыянальнае выхаваньне, каб масы сыстэматычна знаёміліся з грамадзкім і палітычным ладам у тай ці іншай краіне, канкрэтнымі фактамі заключэньня рабочых у турму, жыцьцём і з бытам рабочых.

Савецкія рабочыя, сав. моладзь можа стаць моцным фактарам вялікага ўплыву на замежных таварышоў, магутным правадыром нашых ідэй у шырокія колы замежных таварышоў, але толькі ў тым выпадку, калі будуць ведаць умовы, у якіх жывуць нашы замежныя таварышы.

Наша моладзь узрасла ва ўмовах савецкай рэчаіснасьці, яна ня ведае, што значыць нелегальная праца, яна ня ведае прасьледваньняў, яна не загартована ў змаганьні. З усім гэтым яна павінна быць знаёма, калі не са свае практыкі, дык з практыкі замежнай моладзі. А што ведае наша моладзь аб жыцьці і змаганьні за межамі? Ці ведае яна, у якіх умовах працуе нямецкі камсамол, дзе нават у такой «дэмакратычнай краіне», як Нямеччына на 20.500 членаў камсамолу прыходзіцца 1.400.000 членаў рэлігійных арганізацый моладзі. У школах трэба больш увагі аддаць справе інтэрнацыянальнага выхаваньня.

1-га жніўня — **дзень інтэрнацыянальнай баявой пераклічкі рабочых.** Будзем памятаць аб нашых задачах у гэты дзень і ў справе інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Інтэрнацыянальнае выхаваньне мас павінна быць часткай нашай культурнай рэвалюцыі. Як немагчыма будаваць сацыялізму без агульнага ўздыму культуры, так немагчыма будзе выканаць стаячыя перад намі інтэрнацыянальныя задачы без патрэбнага выхаваньня нашых працоўных.

Зьм. СЬНЕЖКА.

### „Цырк масам, мастацтва працоўным"

«Цырк масам, мастацтва працоўным» —гэты лёзунг сьмяецца над глядачом са сьцяны цырку. Сьмяецца ён, урэшце ня над адным толькі глядачом, а над дырэкцыяй цырку таксама.

Сэнс гэтага яскрава выразнага лёзунгу цалком адваротны замыслу дырэкцыі цырку. Чаму цырк масам, а мастацтва працоўным? Чаму мясцовая дырэкцыя ня лічыць цырк мастацтвам, і чаму масы гэта ня тое-ж самае, што працоўныя?

І дзе напісана аб тым, што лёзунг абавязкова трэба дэклямаваць?

Але няма жарту бяз долі праўды. Што цырк няпрыступны працоўным, у гэтым нельга сумнявацца пасьля таго, як вы купіце хоць адзін білет у касе. Так, што нават калі цырк і ёсьць мастацтва, дык мастацтва вельмі недаступнае для працоўных.

Цяпер у Менску Уладзімер Дураў. Яго праца са зьвярамі выклікае цікавасьць глядача. Праца Дурава ня толькі ўскрывае прыроду кожнага зьвера, ёй ломіць прыроду апошняга, адкрывае ў яго здольнасьці ўласьцівыя чалавеку. Гэта вялікае мастацтва. Але-ж Дураў мог укласьці больш зьмест, зьмест палітычна-грамадзкі ў тыя нумары, якія ён выносіць на арэну.

Наогул ніякай палітычнай грамадзкай сатыры мы ня бачым ні ў водным нумары цыркавой праграмы. У акрабатаў яе няма чаго шукаць. Тут толькі сузіральнае мастацтва, інакш быць ня можа. Сатыра можа выявіцца, толькі на слоўным матар'яле, якім уладаюць выключна муштроўшчыкі зьвяроў, клёўны і выканаўцы вакальных нумароў. У іх руках палітычна-сацыяльная сатыра. Усюды, але ня ў Менску. У Менску за апошні месяц сатыра згінула.

Р. Т.

### Паведамленьні

**— Саюз будаўнікоў арганізуе ў чацьвер 18 ліпеня культ-паход членаў саюзу будаўнікоў у дзяржцырк. Білеты па зьніжаных цэнах па рабочкомах.**

**— У сераду, 17 ліпеня, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу імя Р. Люксембург адбудзецца чарговы сход дэлегатак-полек.**

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ


ВЫШАЎ з ДРУКУ і паступіў у продаж

„ЛІПНЁВЫ ГІМН"

Словы Ул. Дубоўкі. Музыка Мік. Равенскага.

Выданьне газэты «ЗЬВЯЗДА».

Цана 15 кап.

Прадаецца ва ўсіх магазынах Белдзяржвыдавецтва.

Заказы накіроўваць у галоўную кантору газэты «Зьвязда» —Менск, Савецкая, 63.

ТЭАТР, КІНО

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА"

Ад аўторка, 16 ліпеня

Новы буйны мастацкі баявік вытв. «Межрабпомфильм»

МАТРОС ГАЛАЙ

у 6 частках.

Рэжысэр—Я. Урынаў. Апэратар—А. Шэленкаў. Мастак С. В. Казлоўскі.

Галоўныя ролі выконваюць народныя артыстыя рэспублікі М. М. Блюмэнталь-Тамарына, заслуж. артысты: А. Пятроўскі, О. Леноная, Е. А. Цяпкіна, Штраух, Вяршынін і інш.

Пачатак роўна а 8 г. увеч. Каса—ад 6 г.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

Ад аўторка, 16 ліпеня

Новы фільм, вытворчасьці ВУФКУ

МЛЫН ПАЎСКРАЙ ЛЕСУ

(МЕЛЬНИЦА НА ОПУШКЕ)

драма ў 6 частках.

У галоўных ролях: Г. Заржэцкая, І. Марозаў, Е. Масьлікаў.

Зьвыш праграмы: Кіно-хроніка Савкіно № 28

Пачатак 1-га сэансу а 7½ гадз. Каса—ад 5½ гадз.

Кіно „СПАРТАК".

Ад аўторка, 16 ліпеня, грандыёзны замежны фільм

„БЛАНШЭТ" драма ў 7 част.

Каса—ад 6 гадз. Пачатак а 7 гадз. увеч.

Кіно-сад „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Ад аўторка, 16 ліпеня

2 мастацкія фільмы ў адзін сэанс 2

I ТРЫ ПАКОІ З КУХНЯЮ | II Па Конго

Пачатак сэансаў а 9 15 і 10 45

Каса—ад 6 гадз.

У САДЗЕ а 7 гадз. ГРАЕ ДУХАВЫ АРКЕСТР.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"

Ад аўторка 16 ліпеня

2 БАЯВІКІ У АДЗІН СЭАНС 2

1. ІГАР ІЛЬЛІНСКІ у фільме ЛЯЛЬКА З МІЛЬЁНАМІ

2. ГАРОЛЬД ЛЁЙД у фільме МАРАК

Пачатак сэансаў а 7 г. 15 хв.

Каса—ад 6 гадз.

АДПУСКНІКІ!

НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ —— У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У ——

кантору газэты „ЗЬВЯЗДА" Савецкая, 63 тэл. 7-81

ВАШ НОВЫ АДРАС

Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня ў водпуску

без асобнай даплаты за перамену адрасу.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

АДКРЫЦЬЦЕ ГАСТРОЛЯЙ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ І КАМОПЭРЫ

Серада, 17-га і чацьвер, 18 ліпеня — 1-ы РАЗ у МЕНСКУ

РОЗ-МАРИ музкамэдыя ў 3-х дз. і 9 абразох, расійскі пераклад Феона

—) Новыя дэкарацыі афарм. мастака Л. Леапідава (—

ПЯТНІЦА, 19 ЛІПЕНЯ — ПАПУЛЯРНАЯ МУЗКАМЭДЫЯ

ЖРЫЦА ОГНЯ у 3-х дз.

Білеты ў касе тэатру ад 12—2 ч. і ад 5 ч. дня і ў раб. касе ад 12—2-х ч. і ад 4—6 ч. увечары

Падрабязнасьці ў афішах Дырэкцыя

СЁНЬНЯ аўторак 16 ліпеня

ДЗЯРЖЦЫРК | АПОШНІЯ 6 ДЗЁН

Гастролі Маскоўск. Дзяржаўн. цырку

ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ УСЕ АРТЫСТЫЯ ЦЫРКУ

Гастролі УЛАДЗІМЕРА ДУРАВА (Малодшага)

толькі з дні САБАЧАЕ ВЯСЕЛЬЛЕ толькі з дні

пантаміма ў выкананьні жывёлін, у 2-х актах, спэцыяльныя дэкарацыі.

А таксама неадменнае выступленьне любімцаў публікі

Морскіх львоў, сланя Макса і інш. жывёліна

З ПРЫЧЫНЫ ВЯЛІЗАРНАЙ ПРАГРАМЫ

—) ПАЧАТАК РОЎНА А 9 ГАЗ. УВЕЧ. (—

ЛЯЧЭБНІЦА МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА МЭДЫЦЫНА-САНІТАРН. Т-ВА

Ленінская (побач з 2-м Домам Саветаў), № 25, тэл. 12-66

АДКРЫТА ад 3 г. дня да 9 г. увеч

Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутраныя, хірургічныя, жаночыя, зубныя, вока нораў, вуха, горла, носа і скуры

Фізіятрычны габінэт: кварц, электра і сьвета-лячэньне.

Рэнтгэнаўскі габінэт робіць здымкі, прасьвечваньні і лячэньне хворых. Прыём хоміка-бактэрыял. аналізаў

Кансультацыя прафэсароў — прыём хворых па лекавых кніжках таварыства

Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную плату.

ЮЗХИМТРЕСТ — ЛУЧШИЙ СОВЕТСКИЙ КАРАНДАШ — ХИМЕЙНДИКАТ

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

ЗЬВЯЗДА

ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ

ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ

НА КЛІШЭ

МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЫСУНКАЎ

З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА"-МЕНСК. САВЕЦКАЯ, №63, 3ЦЯ ПАВЕРХ.

ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭНЬНІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ І ІНШЫЯ МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы лічыць несапраўднымі

Пашпарт Грак В. І., выд. Менскай міліцыяй. 2051

Метрычная выпіс Бялер Р. А., выд. Менскім ЗАГС'ам. 2052

Пашпарт Коціна А. Г., выдан. Менскай міліцыяй. 2053

Членская кніжка саюзу СГЛР Івінскага І. І. 2054

Камандыровачн. пасьведч. Озерава М. С., выдан. Менакрва 3-V-29 г. за № Л. С. 5—64. 2055

Пасьведч. Кальба Д. Л., выдан. Менскім ЗАГС'ам. 2056

Даведка, выд. 12-I-29 г. арцелью «Юнасьць» за № 51 на імя Шастаковіча І. В. 2057

Равьліковая кніжка Курачкіна З. Г., выд. Сталінскім буд. аддзелам, Данецкай акругі. 2058

Пасьведч. Станіслевіча К., выд. 11-II-29г. аб скончэньні спэцкласу пры 3-й сав. школе. 2059

Членская кніжка саюзу СГЛР Кізік Н. Р. 2060

Каапэрац. кніжка Наумовіча П. С., выд. Менск. спажывецк. т-вам „Земляроб". 2061

Менск. кніжка № 1.382 Хэйфеца Х. Т., выд. Менск. т-вам саматужнікаў. 2062

Чл. кніжка саюзу хімікаў Захарава Ф. Г. 2063

Дапрызыўная кніжка Лемеша І. Ф., выд. Менск. ваенкаматам. 2064

Пасьведч. Бірульчыка С. І., выд. ЦІТ'ам аб скончэньні кузьнечнага цэху. 2065

ПРАДАЮЦЦА

БОЧКІ з жалезнымі абручамі ад друкарскай фарбы.

БАЛЁНЫ у плеценых кашох з-пад саляной кіслаты.

Зварочвацца да заг. гаспад. друк. «Зьвязды» (Савецкая, 63) ад 3—5 гадз. дня.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ даставкі газэты „ЗЬВЯЗДА" вэанеце па тэл. 2-49


Друкарня газэты «Зьвязда». Менск

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2